Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛЮТАГА 2015 г. АЎТОРАК № 20 (27878) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Не давайце ў рукі картку

СТАР. 4

Батлейка ажыла

СТАР. 8

Азаранка выцягне зборную

СТАР. 15

ЦЫТАТА ДНЯ

Леанід МАЛЬЦАЎ, старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта:

«Нам здавалася, што чалавецтва, перажыўшы дзве сусветныя вайны, дзясяткі лакальных войнаў і ўзброеных канфліктаў, можа атрымаць вопыт з трагічнага мінулага. На вялікі жаль, гэтага не здарылася. Сёння геапалітычнае становішча ў свеце і вакол нашай краіны становіцца ўсё больш складаным. Ёсць факты легкадумнага падыходу ў ацэнцы злачынстваў фашызму, неразуменне небяспекі яго адраджэння. Эстафета ў гонар 70-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне ўздоўж межаў СНД павінна ўнесці свой уклад у захаванне і ўмацаванне нашай галоўнай каштоўнасці — адзінства і згуртаванасці народаў. Яна пранясе па краінах СНД ідэю, што толькі мір і згода, узаемадзеянне і ўзаемадапамога служаць надзейным падмуркам дабрабыту любой краіны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.02.2015 г.

Долар ЗША	15450,00	▲
Еўра	17460,00	▲
Рас. руб.	223,00	▼
Укр. грыўня	984,50	▲

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 15020>

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Рэцэпт гарбаты ад хатняй гаспадыні

МАСТАЦТВА ЗАВАРВАЦЬ ЧАЙ ПРАДЭМАНСТРАВАЎ ПЕРШЫ ЧАЙНЫ ЧЭМПІЯНАТ КРАІНЫ

Хатняя гаспадыня са сталіцы Людміла НАВАКОЎСКАЯ (*на фота*) — гурман, яна ведае безліч рэцэптаў заварвання гарбаты. Знаўца гэтага напою, яна была ўдзельніцай першага чайнага чэмпіянату Беларусі, які прайшоў у мінулую нядзелю ў Мінску.

СТАР. 12

Як нацыянальнае становіцца сусветным

Ці верагодна далейшае пашырэнне Спісу сусветнай спадчыны?

Мінулы год быў юбілейным для супрацоўніцтва нашай краіны з ЮНЕСКА — адзначалася 60-годдзе членства Беларусі ў гэтай арганізацыі. Пра тое, як сёння развіваецца ўзаемадзеянне з ЮНЕСКА, якія нашы прыродныя і архітэктурныя славутасці маюць рэальныя шанцы ў хуткім часе папоўніць Спіс сусветнай спадчыны і ці ёсць нейкія зрухі ў пошуках крыжа Еўфрасінні Полацкай, нам расказаў Юрый АМБРАЗЕВІЧ, начальнік галоўнага ўпраўлення шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў, адказны сакратар Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА.

— У папярэднім спісе сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны нашай краіны налічваецца 10 нацыянальных аб'ектаў. Што перашкаджае іх уключэнню ў асноўны спіс? Які з аб'ектаў можа ўвайсці туды ў бліжэйшыя гады?

— Працэдура ўключэння нацыянальнага аб'екта ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА прадугледжвае, што ён павінен не менш за год знаходзіцца ў папярэднім спісе. Нацыянальная частка ў ім, якая дагэтуль уключала 10 аб'ектаў, не пераглядалася з 2004 года і, у адпаведнасці з правіламі ЮНЕСКА, цяпер аднаўляецца. Міністэрства культуры нашай краіны сумесна з іншымі зацікаўленымі бакамі займаецца гэтым. Новы папярэдні спіс будзе ўключаць пяць аб'ектаў. Гэта нам дазволіць сфакусіраваць нашы намаганні на падрыхтоўцы якасных наменацыйных заяў і іх прасоўванні ў Спіс сусветнай спадчыны. Два з іх — «Матэрыяльнае ўвасабленне духоўнай спадчыны святой Еўфрасінні Полацкай» і «Аўгустоўскі канал — твор чалавека і прыроды» — сумесна з Рэспублікай Польшча плануецца ўнесці ў асноўны спіс на працягу 2015-2016 гадоў.

СТАР. 13

ПЕРАМОГ — РЭКЛАМУЙ!

Падведзены вынікі конкурсу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» за 2014 год

Лаўрэатамі цяперашняга конкурсу прызнаны 253 тавары, якія выпускаюцца 145 арганізацыямі рэспублікі.

Так, у намінацыі «Харчовыя тавары» лепшымі сталі 166 найменняў прадукцыі 79 айчынных прадпрыемстваў. У намінацыі «Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння» вызначаны 52 тавары-пераможцы 41-го прадпрыемства»; «Прамысловыя тавары для насельніцтва і вырабы народных промыслаў» — 29 тавараў, што выпускаюцца 21 арганізацыяй.

Званне лаўрэата конкурсу ў намінацыі «Паслугі насельніцтву» ўдастоены ВРУП «Брэстаблгаз», Гомельскае РУП электраэнергетыкі «Гомельэнерга», Выдавецкі дом «Вячэрні Гомель-Медыя», «Нацыянальны аэрапорт «Мінск», Мінскі метрапалітэн, ЗАТ «Белзамежбуд».

Статус «Навінка года», заснаваны з мэтай стымулявання выпуску новых відаў прадукцыі, паляпшэння яе характарыстык і ўласцівасцяў, прымянення сучасных тэхналогій і матэрыялаў, прысуджаны 18 таварам рознага прызначэння.

— Многія прадпрыемствы рэспублікі з года ў год удзельнічаюць у конкурсе і перамагаюць у ім, стабільна забяспечваючы высокі ўзровень прадукцыі, пашыраючы яе асартымент, удасканальваючы спажывецкія ўласцівасці, ужываючы сучасныя віды ўпакоўкі, — падкрэслілі ў прэс-службе Дзяржстандарта. — У ліку такіх прадпрыемстваў — ААТ «Савушкін прадукт», Маларыцкі кансерва-агароднінасушыльны камбінат, ААТ «Малочны Свет», «Беллакт», «Спартак», «Камунарка», Барысаўскі мясакамбінат, «Бабулін гладыш» — кіруючая кампанія холдынга «Магілёўская малочная кампанія «Бабулін гладыш», СТАА «Белвес», ЧП «Сан Марка», завод аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «МАЗ-Купава» ды інш.

Як адзначылі ў прэс-службе Дзяржстандарта, асаблівую ўвагу спажыўцы надаюць прадуктам здаровага харчавання, і айчынныя вытворцы ўлічваюць гэтую тэндэнцыю. Дарэчы, у ліку пераможцаў рэспубліканскага конкурсу ёсць адразу некалькі тавараў гэтай лініі — сухія сняданкі (філіял ААТ «Берасцейскі пекар» Ганцавіцкі хлебазавод, ААТ «Лідскія харчовыя канцэнтраты»), біянапітак (Бярозаўскі сыраробны камбінат), смятана з харчовым валакном (ААТ «Малочны Свет») і інш.

У конкурсным руху за лепшыя тавары актыўна ўдзельнічаюць арганізацыі малога і сярэдняга бізнесу, якія прапануюць канкурэнтаздольную, у тым ліку імпартазамяшчальную, прадукцыю. Тут можна адзначыць ТДА «Беллесвыраб» (дзверы ўнутраныя міжпакаёвыя драўляныя), ЧП «Сан Марка» (паўчаравікі хлапчуковыя з верхам з натуральнай скуры клеявога метаду мацавання), ВПУП «Вікторыя» (каструля АЛА, патэльня нізкая АЛА), СТАА «Дабрыня» (пліты пенаполістырольныя цеплаізаляцыйныя) і інш.

Арганізацыям, тавары якіх удастоены звання лаўрэата, будуць уручаны дыпломы і дадзена права размяшчэння лагатыпа конкурсу на таварах і іх упакоўцы, а таксама ў дакументацыі і рэкламных матэрыялах.

— Конкурс накіраваны на тое, каб вылучыць тую прадукцыю, якая можа быць названа лепшай. Гэта прадукцыя, якая павінна валодаць пэўнымі спажывецкімі характарыстыкамі: бясспрэчна, быць якаснай, вядомай, а таксама шырока выкарыстоўвацца ў нашай краіне і за яе межамі. Адметнай асаблівасцю гэтага конкурсу з'яўляецца тое, што, падводзячы вынікі, акрамя спажывецкіх характарыстык, экспертная камісія ўвагу надае і таму, як выпускалася прадукцыя, ацэньвае стабільнасць вытворчасці, — адзначыла **дырэктар Беларускага дзяржаўнага інстытута стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС) Ірына АСМОЛА.**

Дар'я ШОЦІК.

Рэспубліканскі конкурс «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» праводзіцца штогод, пачынаючы з 2002 года, па сумеснай ініцыятыве Дзяржстандарта, абласных выканаўчых камітэтаў і Мінгарвыканкама. Ён накіраваны на інфармаванне насельніцтва і арганізацый аб якаснай айчыннай прадукцыі і паслугах у інтарэсах іх прасоўвання на ўнутраным і знешнім рынках; садзейнічанне забеспячэнню спажывецкага рынку рэспублікі высакаякаснымі і канкурэнтаздольнымі айчыннымі таварамі; выяўленне новых, больш дасканалых відаў прадукцыі, з палепшанымі характарыстыкамі, што выпускаюцца з прымяненнем прагрэсіўных тэхналогій.

Удзельнічаць у конкурсе могуць юрыдычныя асобы, незалежна ад формаў уласнасці, і індывідуальныя прадпрымальнікі, зарэгістраваныя ў вызначаным парадку ў Рэспубліцы Беларусь.

Конкурс праводзіцца ў два этапы.

На першым этапе абласнымі конкурснымі камісіямі вызначаюцца тавары-фіналісты, і ў іх ліку — тавары, якія прэтэндуюць на прысуджэнне статусу «Навінка года», для наступнай падачы звестак у сакратарыят рэспубліканскай конкурснай камісіі.

На другім этапе на аснове пададзеных матэрыялаў рэспубліканскай конкурснай камісіяй падводзяцца канчатковыя вынікі конкурсу па прысуджэнні таварам звання лаўрэата і статусу «Навінка года».

Звесткі аб таварах-лаўрэатах і іх вытворцах размяшчаюцца на сайце Дзяржстандарта (www.gosstandart.gov.by) і ў штогадовым ілюстраваным каталогу «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь», які рассылаецца ў прадстаўніцтвы нашай краіны за мяжой.

■ Надвор'е

Паварот на сапраўдную зіму

У пятніцу на поўначы падмарозіць да мінус 17 градусаў

На гэтым тыдні надвор'е на тэрыторыі Беларусі будзе мець сапраўды зімовы характар, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА. У аўторак пры панізжаным фоне атмасфернага ціску ў большасці раёнаў пройдзе снег, месцамі будзе слабы туман. На дарогах часам галалёдзіца.

Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. А ў сераду і чацвер да нас завітае больш халоднае паветра з боку Балтыйскага мора. Таму месцамі пройдзе кароткачасовы снег, а на асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе мінус 2-7 градусаў, пры праясненнях — да 10 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 3 да плюс 2 градусаў. Уначы на чацвер стане яшчэ халадней, калі чакаецца 3-10 марозу, а пры праясненнях — да мінус 15 градусаў. Удзень будзе ад мінус 5 да плюс 1 градуса. Вельмі халодна на гэтым тыдні будзе ў пятніцу. Тады павялічыцца атмасферны ціск і ападкаў ужо не прадбачыцца. Тэмпература паветра ўначы будзе 3-10 марозу, а па паўночнай палове краіны — да мінус 11-17 градусаў. Удзень будзе мінус 1-8 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, напрыканцы тыдня сур'ёзны холад уначы завітае і ў другую палову краіны. На выхадныя месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе ў межах мінус 5-12 градусаў, на поўдні краіны — да 17 марозу. Удзень чакаецца ад 0 да мінус 6 градусаў. Сіноптыкі прагназуюць, што ў нядзелю стане прыкладна на 2-3 градусы цяплей. Вось тады чакаецца, што да нас пачне паціху паступаць больш вільготнае паветра з боку Атлантыкі.

Сяргей КУРКАЧ

■

Пайшоў з жыцця Ігнат Пятровіч Антонаў, вядомы беларускі вучоны, клініцыст-неўрапатолаг, акадэмік НАН Беларусі, член-карэспандэнт АМН Расіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, народны ўрач Беларусі, ганаровы грамадзянін горада Мінска... Яго званні і рэгаліі можна пералічваць, здаецца, бясконца. Нарадзіўся Ігнат Пятровіч 28 снежня 1922 года ў Суражы. У 1940 годзе з адзнакай закончыў Віцебскую фельчарска-акушэрскую школу, паступіў у Віцебскі медыцынскі інстытут. Вялікая Айчынная вайна перапыніла яго вучобу ў інстытуце. Ад Сталінграда да Кёнігсберга прайшоў яго баявы шлях. Удзельнічаў у баях пад Прохараўкай на Курскай дузе, удзельнічаў у вызваленні Беларусі, у складзе танкавага ўзвода адным з першых уварваўся ў Мінск 3 ліпеня 1944-га, быў паранены.

Пасля Перамогі вярнуўся ў сталіцу, у 1950-м зноў жа з адзнакай закончыў медыцынскі інстытут, ужо ў студэнцкія гады праявіўшы вялікія здольнасці да навуковай працы. Яны, гэтыя здольнасці, яскрава раскрыліся ў Беларускім НДІ неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі, дзе ён стаў працаваць і які затым узначальваў на працягу амаль 40 гадоў. Яго пяру належаць 9 манаграфій, якія ахопліваюць вялікі спектр неўралагічных праблем, у спісе яго навуковых прац больш за 520 публікацый. Ігнат Пятровіч — аўтар 13 вынаходак, 16 рацыяналізатарскіх прапаноў і 20 метадычных рэкамендацый. Вынікі гэтых даследаванняў працягваюць шырока ўкараняцца ў практыку айчыннай аховы здароўя.

Увесь жыццёвы, працоўны і проста чалавечы шлях Ігната Пятровіча Антонава — узор і прыклад таго, як трэба жыць і працаваць, каб пакінуць след на зямлі.

СПАЧУВАЕМ РОДНЫМ І БЛІЗКІМ.

■ Погляд

ГРЭЧАСКІ ДЭБЮТ

Парламенцкія выбары, якія адбыліся ў Грэцыі, упершыню апраўдалі самыя змрочныя чаканні Еўракамісіі пра негатыўны ўплыў сусветнага фінансавага крызісу на ўзровень даверу насельніцтва асобных краін да еўраінтэграцыі.

Безумоўна, перш за ўсё тых краін, на якіх гэты крызіс адбіўся найбольш негатыўна. Страта за гады крызісу амаль траціны эканомікі, пастаянныя рэкорды па ўзроўні беспрацоўя, у сувязі з якімі чвэрць работнікаў не можа знайсці працоўныя месцы, памяншэнне заробкаў бюджэтнікам — усё гэта стала штодзённым жыццём для грэкаў у складзе Еўрапейскага саюза і еўразоны ў апошнія сем гадоў. Насельніцтва страціла веру ў тое, што гэтыя негатыўныя наступствы атрымаецца пераадолець пры дапамозе пастаяннай эканоміі і знешняга фінансавага кіравання з боку замежных структур, і масава прагаласавала за палітычную сілу, якая выступіла з рэзкай крытыкай еўраінстытутаў і заклікам вярнуць кіраванне Грэцыяй у рукі саміх грэкаў.

Партыя СІРЫЗА, што перамагла на выбарах на адзінаццаты год свайго існавання, змагла сабраць амаль палову дэпутацкіх месцаў у парламенце. Яшчэ нядаўна яна лічылася праземрна радыкальнай для таго, каб прыцягнуць вялікую колькасць выбаршчыкаў, а сёння сваёй перамогай даказала рэзкую змену адносін грамадзян Грэцыі да левых

і ўльтралевых поглядаў. А паколькі яшчэ перад выбарамі яна дасягнула папярэдняй дамоўленасці аб супрацоўніцтве з адной з дробных партый Грэцыі (правай партыяй «Незалежныя грэкі»), быў сфарміраваны кааліцыйны ўрад, які ўзначаліў лідар СІРЫЗА Алексіс Цыпрас.

Найбольш радасна на перамогу СІРЫЗА адрэагавалі ў Расіі. Прыход у Грэцыі да ўлады новай сілы, з якой наладжаны дастаткова перспектыўныя адносіны, выгадны для Масквы на фоне актыўнага абмеркавання новага пакета санкцый супраць Расіі праз актывізацыю ваенных дзеянняў на тэрыторыі Украіны ў супрацьстаянні Кіева з сепаратыстамі. Заходнія сродкі масавай інфармацыі невыпадкова падкрэсліваюць, што першым замежным дыпламатам, з якім сустрэўся Алексіс Цыпрас, стаў пасол Расіі з віншаваннямі ад Уладзіміра Пуціна.

Але не будзем забываць пра тое, што наяўнасць у лідараў СІРЫЗА сімпатыі да Расіі не азначае, што Грэцыя пры новым урадзе будзе гатова ахвяраваць сваімі нацыянальнымі інтарэсамі дзеля Масквы. А яны ў гэты момант сканцэнтраваны на галоўнай праблеме: Грэцыі прыходзіцца аддаваць штогод такія непамерныя сумы на абслугоўванне велізарнага знешняга доўгу, што эканоміка не можа развівацца. І новы ўрад, калі хоча захаваць давер народа і пазбегнуць датэрміновых парламенцкіх выбараў, павінен вырашыць гэту праблему. А паколькі Расія цяпер сама знаходзіцца ў складанай фінансавай сітуацыі, дапамагчы Грэцыі яна не ў стане.

Адпаведна, ад лідараў СІРЫЗА лагічна чакаць, што яны будуць выкарыстоўваць сваю асаблівую пазіцыю па Расіі ў якасці разменнай манеты для торгу са сваімі крэдыторамі. Удасца дамовіцца з еўраструктурамі і крэдыторамі аб замарожванні выплаты працэнтаў на пяць гадоў і спісанні часткі доўгу — і новы грэчаскі ўрад саступіць у адносінах да ўвядзення дадатковых санкцый супраць Расіі. Таму па гэтым пытанні пазіцыя Расіі ў ЕС умацоўваецца толькі пакуль грэкам не ўдасца ўрэгуляваць свае фінансавыя рознагалоссі або калі крэдыторы Грэцыі наогул адмовяцца ісці новаму ўраду насустрач.

Такая ж сітуацыя і з магчымасцю выхаду Грэцыі з еўразоны, што абмяркоўваецца ў СМІ. Пры ўсёй справядлівай крытыцы ранейшых улад за занадта паспешную адмову ад драхмы і пераход да еўра, выхад з еўразоны можа сур'ёзна пагоршыць эканамічную сітуацыю ў Грэцыі праз непазбежную паніку і масавы адток інвестыцый. Таму пагроза выхаду Грэцыі з еўразоны, хутчэй за ўсё, будзе выкарыстоўвацца ў крайніх выпадках, каб прасунуць выгадны для СІРЫЗА варыянт вырашэння пытання з пазыковай залежнасцю. А сама СІРЫЗА будзе арыентавацца на вынікі апытанняў, якія сведчаць пра жаданне больш як 70% грамадзян Грэцыі застацца ў еўразоне.

Падобным чынам можа скласціся і сітуацыя з членствам Грэцыі ў НАТА. Безумоўна, крытыка НАТА, якая ажыццяўляецца кіраўніцтвам СІРЫЗА, стане важным аргументам для ціску на крэдытораў і заходнія фінансавыя структуры. Але да выхаду Грэцыі з гэтай арганізацыі справа можа дайсці толькі ў самым драматычным сцэнарыі.

Ад лідараў СІРЫЗА лагічна чакаць, што яны будуць выкарыстоўваць сваю асаблівую пазіцыю па Расіі ў якасці разменнай манеты для торгу са сваімі крэдыторамі.

Неабходна таксама адзначыць, што перамога СІРЫЗА на выбарах ускладніла ўнутранае жыццё Еўрасаюза. Яна стала магчымай пры вялізным ціску еўраструктур на грэкаў, якіх запалохвалі драматычнымі наступствамі ў выпадку прыходу гэтай партыі да ўлады. Але тое не перашкодзіла грэчаскім выбаршчыкам застацца на сваіх пазіцыях. У тых краінах ЕС, дзе ёсць таксама сур'ёзныя складанасці праз эканамічныя праблемы, перамога СІРЫЗА натхніць падобныя палітычныя сілы на больш рашучую барацьбу за ўладу. Лягчэй ім будзе і ўдзельнічаць у выбарах пасля грэчаскага прэцэдэнту, на які яны будуць актыўна спасылацца. Але, безумоўна, у тым выпадку, калі новы грэчаскі ўрад зможа выканаць свае абяцанні і захавае давер выбаршчыкаў.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■

■ Новаўвядзенне

Чым далей — тым даражэй

Дыферэнцаваныя тарыфы на праезд у грамадскім транспарце сталіцы, хутчэй за ўсё, спачатку ўвядуць у метрапалітэне. Пра гэта падчас чарговай суботняй «прамой лініі» паведаміла намеснік старшыні Мінгарвыканкама Жанна БІРЫЧ. Раней планавалася, што ўвядзенне дыферэнцаваных тарыфаў пачнецца з прыгарадных маршрутаў.

Па словах Жанны Бірыч, новы від аплаты за праезд з'явіцца сёлета ў мінскай падземцы ўжо ў першым паўгоддзі. Плануецца, што да канца года і астатні грамадскі транспарт пяройдзе на дыферэнцаваную аплату. Аднак у «Мінсктрансе» тэрміны пакуль не ўдакладняюць.

«Мы ўжо займаемся ўкараненнем гэтай сістэмы ў прыгарадным транспарце, увесь рухомы састаў абсталяваны. Але дагавор пакуль не заключаны», — патлумачыла «Звяздзе» **намеснік генеральнага дырэктара па эканоміцы «Мінсктранса» Ірына ЯКУБОЎСКАЯ.**

Адзінае, што ўжо дакладна вядома, гэта крытэрый, па якім будзе ўведзена дыферэнцыяцыя тарыфаў. Калі раней спецыялісты вагаліся паміж часам паездкі і адлегласцю, цяпер прыйшлі да высновы, што плаціць пасажыры будуць за пэўную адлегласць, зыходзячы з вызначанага кошту за 1 км.

Раней дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый Шкуратаў тлумачыў, што гараджане не хочуць плаціць аднолькавыя грошы за розны кіламетраж, да таго ж транспартны сродак можа трапіць у затор, і часавы праязны будзе змарнаваны. З аплатай за адлегласць такога не здарыцца. Падобны расклад будзе выгадны для пасажыраў, а таксама паспрыяе змяншэнню колькасці безбілетнікаў у транспарце.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■

■ Здарэнне

УЗАРВАЎ... САМ СЯБЕ?

Прыкладна а 9 гадзіне вечара ў нядзелю ў Бабруйску адбылася трагедыя — каля адной з крам на вуліцы Батава раздаўся выбух, у выніку якога загінуў мужчына. Верагодна, такім чынам ён скончыў жыццё самагубствам. Са слоў відавочцаў, за некалькі хвілін да гэтага пацярпелы ў нецвярозым стане заходзіў у краму і набываў алкаголь.

bobruisk.ru

На шчасце, ніхто з навакольных ад выбуху не пацярпеў. Эвакуацыя жыхароў найбліжэйшых дамоў не праводзілася: патрэбы ў гэтым не было. Як распавяла карэспандэнту «Звязды» **старшы інспектар групы інфармацыі і грамадскіх сувязяў упраўлення ўнутраных спраў Бабруйскага гарвыканкама Таццяна ГАРБАНЮК,** асоба загінулага ўжо ўстаноўлена. Гэта мясцовы 59-гадовы жыхар. Тып выбуховай прылады, якой скарыстаўся мужчына, пакуль не вызначаны.

Паводле слоў адной з жыхарак вуліцы Батава, якой мы патэлефанавалі, выбух быў невялікай сілы — пра здарэнне яна даведалася, пачуўшы гук міліцэйскіх сірэн. Як паведамляюць мясцовыя СМІ, будынак крамы не атрымаў вялікіх пашкоджанняў, за выключэннем трэснутага шклопакета.

На гэты момант праводзяцца неабходныя следчыя мерапрыемствы, у тым ліку судова-медыцынская экспертыза і крыміналістычная экспертыза па выбуховай прыладзе. Заведзена крымінальная справа па часці 2 артыкула 295 (набыццё і захоўванне выбуховай прылады) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

■ Курсавая розніца

ІМКНЕННЕ ДА РАЎНАВАГІ

Чаму «амерыканец» мацнее? Ці спыніцца падзенне расійскага рубля? Чаго чакаць у найбліжэйшы час на айчынным валютным рынку? На гэтыя пытанні адказаў карэспандэнту «Звязды» Міхаіл ГРАЧОЎ, эксперт кампаніі «Бізнес-Форэкс».

«У першы месяц 2015-га захавалася тэндэнцыя другой паловы мінулага года на ўмацаванне долара ЗША. Яно адбываецца не толькі ў дачыненні да валюты Еўрапейскага саюза, але і да асноўных валют свету.

Індэкс долара DXY 22 студзеня паказаў максімум у 95,75 пункта на фоне аб'явы Еўрапейскім Цэнтрабанкам аб пачатку маштабнай праграмы колькаснага змякчэння, — гаворыць спецыяліст. — На працягу 1,5 года ЕЦБ плануе ўвесці ў абарачэнне 1,06 трлн еўра, па 60 млрд штомесяц. Гэтыя фактары, у сукупнасці з усё горшай статыстыкай з еўразоны, працягнуць ціск на еўра. Высокая верагоднасць, што ў бліжэйшыя два-тры месяцы курс еўра да долара панізіцца да парытэту».

Фота Пятра ФАМІНА.

Наш эксперт даволі негатыўна характарызуе і сітуацыю з валютай суседкі: «На расійскі рубель працягваюць аказваць ціск палітычныя фактары ў выглядзе канфлікту ва Украіне, які нарастае, і эканамічныя — цэны на нафту. Украінскае супрацьстаянне пераходзіць у зацяжную фазу, ЗША і саюзнікі не адмаўляюцца ад палітыкі санкцыйнага ціску. Больш за тое, на фоне ўзмацнення баявых дзеянняў гучаць пагрозы і аб пашырэнні мер ціску, напрыклад, адключэнні расійскіх банкаў ад сістэмы міжнароднага банкінгу SWIFT.

Урад РФ адказаў, што мае ўзаемныя рычагі ўздзеяння на Захад. Пра што ідзе гаворка, агучана не было, але сам факт падобнай сваркі не дадае аптымізму інвестарам. Такім чынам, істотнага ўмацавання расійскага рубля ў бліжэйшы час не прадбачыцца. Верагодна, пры ўмове стабілізацыі цэн на нафту ў раёне 50 долараў за барэль, расійскі рубель будзе вагацца ў калідоры 65-70 рублёў за долар. Крыху асцярожнага аптымізму дадало рашэнне Цэнтрабанка Расіі 30 студзеня 2015 года аб зніжэнні ключавой стаўкі да 15%.

Беларуская нацыянальная валюта паказвае імкненне да стабілізацыі.

Гэты захад павінен ажывіць крэдытны рынак, што ў канчатковым выніку падтрымае расійскую валюту». Аднак банкі, як паказваюць апошнія навіны з Расіі, не вельмі спяшаюцца зніжаць стаўкі.

А вось беларуская нацыянальная валюта, на думку Міхаіла Грачова, паказвае імкненне да стабілізацыі. «Канчатковая карэкцыя магчымая на працягу бліжэйшых аднаго-двух тыдняў, — заяўляе эксперт. — З пачатку лютага ўступае ў сілу шэраг нарматыўных актаў Нацыянальнага банка, накіраваных на адмену абмежаванняў, уведзеных у снежні 2014-га з мэтай стабілізацыі валютнага абарачэння. Напрыклад, прынята пастанова, якая прадугледжвае продаж у поўным аб'ёме замежнай валюты, набытай банкамі за кошт уласных сродкаў, на Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама ў фізічных асоб. У бліжэйшы час будзе разгледжана пытанне аб зняцці абмежаванняў на ажыццяўленне куплі-продажу замежнай валюты на пазабіржавым валютным рынку.

Гэтыя меры, у сукупнасці са стабілізацыяй расійскага рубля як нашага асноўнага партнёра, павінны прывесці беларускую валюту да пункта раўнавагі. Некаторы рост магчымы, але, верагодна, ён не будзе мець агрэсіўнага характару. Ілюстрацыяй гэтага можа служыць сённяшняе зніжэнне беларускага рубля ў дачыненні да трохвалютнага кошыка на 0,04% за кошт зніжэння да долара і еўра. Такім чынам, антыінфляцыйная накіраванасць палітыкі Нацыянальнага банка цалкам можа прывесці да стабілізацыі курсу нацыянальнай валюты».

Нагадаем, што ўчора долар падаражэў адносна нашай нацыянальнай валюты на 50 рублёў — да 15450. Еўра падняўся на 20 рублёў — да 17460. Расійскі рубель патаннеў на 0,5 грашовай адзінкі — да 223.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

СПУСЦІЎ У КАЗІНО ЧУЖЫЯ ГРОШЫ

У Партызанскі РУУС сталіцы звярнулася дзяўчына, якая даверыла свайму знаёмаму 12,3 тысячы долараў. Міліцыянеры высветлілі, што той чужыя грошы... прайграў у казіно.

— Мінчанка была знаёмая з маладым чалавекам каля года, падтрымлівала з ім сяброўскія адносіны, — расказала **прэс-афіцэр Наталля ГАНУСЕВІЧ**. — Дзяўчыне спатрэбілася тэрмінова ўнесці ўзнос на будаўніцтва жылля. Пакалькі вольнага часу ў яе не было, а зберажэнні захоўваліся ў валюце, яна папрасіла сябра абмяняць долары на рублі. Той пагадзіўся дапамагчы, узяў грошы і знік... Як потым было высветлена, малады чалавек прайграў іх у казіно. Заведзена крымінальная справа па артыкуле «Прысваенне ці растрата».

«ВЫКРАЛА» ДЗЕЛЯ ЖАРТУ

Дзяўчына пасля сваркі з грамадзянскім мужам даслала яму і сваёй сястры паведамленне пра... уласнае выкраданне.

Увечары пасля высвятлення адносінаў 22-гадовая мінчанка накіравалася ў краму па цыгарэты. А літаральна праз паўгадзіны мужчына атрымаў SMS, у якім гаварылася, што яго жонка скрадзеная за даўгі. Грамадзянскі сужэнец паспрабаваў дазваніцца на нумар, аднак слухаўку ніхто не браў. А неўзабаве прыйшла другая SMS: «Калі хочаш пабачыць яе жывой, заплаці дзве тысячы долараў». Усхваляваны мужчына кінуўся ў міліцыю. У гэты ж час падобныя паведамленні атрымала і сястра «выкрадзенай». У гэтым выпадку патрабавалі заплаціць тысячу долараў.

— Супрацоўнікі міліцыі ўстанавілі, што паведамленні пра выкраданне грамадзянскаму мужу і сястры адпраўляла непасрэдна сама «ахвяра выкрадання», — паведаміла **прэс-афіцэр Першамайскага РУУС г. Мінска Святлана БІЛІНСКАЯ.** — Ужо праз шэсць гадзін дзяўчына была затрымана на чыгуначным вакзале ў сталіцы. Яна ў стане алкагольнага ап'янення бавіла час у кампаніі трох раней судзімых знаёмых. Высветлілася, што маці дваіх дзяцей, якая цяпер знаходзіцца ў водпуску па доглядзе іх, і раней неаднаразова сыходзіла з дому. Бывала, што адсутнічала па тыдні, злоўжываючы алкаголем. Маленькія сын і дачка заставаліся з грамадзянскім сужэнцам ці яго роднымі. Што датычыцца сітуацыі з «выкраданнем», дык дзяўчына патлумачыла свой учынак жаданнем... пажартаваць.

ЁСЦЬ ЧАМУ КАРАНІ ПУСЦІЦЬ!

Лесаводы краіны стварылі рэкордны запас насення хваёвых пародаў.

— Сёння на захоўванні ў халадзільных камерах лесанасенных цэхаў лясгасаў знаходзіцца амаль 17 тон пасяўнога матэрыялу сасны, елкі, — паведамілі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі. — Гэты аб'ём — адмысловы стратэгічны запас, які забяспечвае на выпадак неўраджайных гадоў патрэбу лясгасаў у пасяўным матэрыяле.

Усяго летась лясгасамі галіны было нарыхтавана 71,2 тоны лясного насення. У тым ліку 52,7 тоны жалудоў дуба, з якіх 3,6 тоны — селекцыйных. Ураджайным стаў мінулы год на насенне хваёвых пародаў. 10,2 тоны пасяўнога матэрыялу (пераважна сасны) — столькі было нарыхтавана ў 2014 годзе (у 2013-м — толькі 3,1 тоны), з якіх 2 тоны — селекцыйных (у 2013 годзе — 0,8 тоны). Мяркуецца, што сёлетні сезон стане рэкордным па аб'ёмах нарыхтоўкі яловага насення.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗМЕІ МЯЖУ НЕ ПЕРАПАЎЗЛІ

У пасажырскім цягніку «Кіеў — Санкт-Пецярбург» мытнікі знайшлі жывых рэптылій.

6 тыгровых пітонаў даўжынёй каля 60-65 см ва ўзросце ад 3 да 6 месяцаў і 6 малочных змей ва ўзросце каля 3 месяцаў былі схаваны паміж столлю і дахам у купэ адной з правадніц. Да гэтага жанчына адмовілася ад прапановы задэкляраваць магчымы тавар. У прэс-групе Гомельскай мытні расказалі, што грамадзянка схавала рэптылій ад мытнага кантролю, каб перадаць іх незнаёмым ёй людзям у Гомелі, Магілёве і Санкт-Пецярбургу. Між іншым, прыкладны кошт канфіскаваных змей — каля Br73 млн. Жывы тавар адправілі для захоўвання ў адну з заалагічных крам Гомеля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Фінансавы выдатнік

РУКІ ПРЭЧ!

або Віртуальны кашалёк трэба зрабіць недатыкальным

А прынцып нулявой адказнасці на 100% вяртанне грошай не гарантуе

Махлярства па картках можна ўмоўна падзяліць на дзве вялікія групы: ашуканства ў віртуальным асяроддзі (інтэрнэт-махлярства) і рэальны падман у фізічнай сетцы (да яго адносяцца скімінг, ліванскія завесы, фантомныя банкаматы і інш.). У апошні час усё больш банкаў і нават краіны пераходзяць да эмісіі картак з чыпам. Паралельна ў свеце назіраецца рост электроннай камерцыі. Таму пытанне жульніцтва з матэрыяльнымі носьбітамі банкаўскай інфармацыі робіцца ўсё менш і менш актуальным. Зламыснікі ўсё часцей сыходзяць у інтэрнэт.

БЕЗ КРЫМІНАЛЬНЫХ АДБІТКАЎ

— У віртуальным асяроддзі фізічных слядоў махлярства менш. У інтэрнэце ўзаемаадносіны паміж злачынцамі шматузроўневыя, і, адпаведна, зламыснік менш рызыкуе быць злоўленым. Сваволіць у інтэрнэце ашуканцам бяспечней, — адзначае **дырэктар плацежнай сістэмы «БелКарт» Аляксандр СОТНІКАЎ**.

Эксперт лічыць, што па меры таго, як карткі з магнітнай паласой будуць замяшчацца дуальнымі (апошнія маюць адначасова магнітную паласу і чып), актуальнасць махлярства ў фізічным асяроддзі будзе набліжацца да нуля. Аднак да таго часу, пакуль на картцы ёсць магнітная паласа і па ёй можна так ці інакш праводзіць аперацыі, пытанне фізічнага махлярства таксама нікуды не знікне.

Каб не вяртаць грошы, банк павінен даказаць, што сродкі з карткі былі скрадзеныя па віне кліента.

— Схемы ўжо даўно адпрацаваны, яны паранейшаму прыносяць злачынцам даход, хоць яго памер паступова і зніжаецца, — адзначае спадар Сотнікаў. — Як толькі ўсе банкі пяройдуць на эмісію картак з чыпам без магнітнай паласы, ашуканцы пачнуць шукаць новыя спосабы счытваць і падрабляць карткі. Наўрад ці ў найбліжэйшай будучыні «шэры сектар» будзе задавальняцца толькі віртуальнай прасторай.

Разам з тым, махлярства, звязанае з банкаўскімі плацежнымі карткамі, часам пераходзіць у «прамежную» зону фізічнай і віртуальнай сетак. Тады ў будучыні падобныя жулікі стануць часцей заражаць банкаматы вірусамі, якія змогуць уплываць на бізнес-працэсы ў іх, або «ўкліньвацца» паміж банкам і канчатковай прыладай (банкаматам). Гэта значна даражэй, чым простыя схемы махлярства, што дзейнічаюць цяпер. Аднак і такія схемы ўжо распрацаваны і выкарыстоўваюцца, але маштабы іх ужывання яшчэ не вельмі вялікія.

КАСІРУ МАГАЗІНА Ў РУКІ КАРТКУ ПАЖАДАНА НЕ ДАВАЦЬ

Зрэшты, ужо сёння нячыстыя на руку людзі вынаходзяць да агіднасці простыя спосабы крадзяжу інфармацыі пра плацежныя карткі і з іх дапамогай ажыццяўляюць пакупкі ў інтэрнэце. З апошніх прыкладаў — 37 чалавек, што сталі ахвярамі касіра аднаго са сталічных супермаркетаў. Да гэтага часу яшчэ не зразумела, якім чынам жанчына захоўвала інфармацыю з картак — ці то валодала фатаграфічнай памяццю, ці то запісвала ў нататнічак, ці то проста фатаграфавала на тэлефон... Але факт застаецца фактам: атрымаўшы ў рукі картку ад кліента крамы, касір дакладна фіксавала яе рэквізіты. А потым з іх дапамогай вельмі «разумная касірка» аплачвала тавары і паслугі ў сеціве.

Каб абараніць сябе і свае грошы, эксперт рэкамендуе выкарыстоўваць у фізічнай сетцы адны карткі, а ў віртуальнай — іншыя.

Як вядома, для разлікаў у інтэрнэце ПІН-код не патрабуецца: дастаткова ведаць нумар карткі, імя трымальніка, тэрмін дзеяння «пластыка» і лічбавы код, які адлюстроўваецца на адваротным баку карткі. Характэрна таксама, што касір у краме сёння мае поўнае права старанна вывучыць вашу картку — паглядзець імя трымальніка, зверыць подпіс на чэку. Таму спрытнаму спецыялісту, які працуе касірам у краме, не вельмі складана скрасці гэтыя рэквізіты.

Для мінімізацыі такіх прымітыўных схем падману проста не трэба даваць картку ў рукі касіру, але ў нашых умовах гэта пакуль нерэальна. А вось у Еўропе ці нават у найбліжэйшай да нас Прыбалтыцы ў крамах шырока распаўсюджана схема абслугоўвання, калі кліент сам праводзіць картку праз тэрмінал і, такім чынам, касір ніяк не кантактуе з ёй. «Гэта, на самай справе, правільны шлях, і я думаю, што мы да яго таксама рана ці позна прыйдзем», — упэўнены Аляксандр Сотнікаў. У Мінску ўжо пачалі з'яўляцца такія крамы. Але ў большасці выпадкаў картку ўсё ж давядзецца даваць касіру ў рукі. Таму, каб абараніць сябе і свае грошы, эксперт рэкамендуе выкарыстоўваць у фізічнай сетцы адны карткі, а ў віртуальнай — іншыя.

ЗАКРЫЦЬ АД ІНТЭРНЭТУ

Самае галоўнае правіла для актыўнага карыстальніка — выключыць магчымасць правядзення транзакцый у інтэрнэце для картак, якія выкарыстоўваюцца ў банкаматах і звычайных крамах. У гэтым выпадку, нават калі такія карткі будуць скрадзены, то махляр не зможа з іх дапамогай ажыццявіць аперацыю ў сетцы інтэрнэт. Цяпер гэта самы разумны і дзейсны спосаб абараніць сябе ад вышэйапісанай сітуацыі з касірам крамы.

Акрамя таго, нават у сеціве ёсць каналы, рызыкі пры выкарыстанні якіх мінімальныя. У Беларусі такім каналам з'яўляецца АРІП, упэўнены наш эксперт. Менавіта гэта гранічна бяспечнае асяроддзе, куды кліент уваходзіць праз уласны інтэрнэт-банкінг і такім чынам ніадзе не «свеціць» нумар і іншыя рэквізіты ўласнай карткі. У гэтым выпадку не мае значэння, асобная ў вас картка для аперацый у інтэрнэце ці не. Акрамя таго, варта ўважліва ставіцца да выбару банка-эмітэнта для разлікаў у інтэрнэце. Ён павінен быць сертыфікаваны на прадастаўленне паслуг з выкарыстаннем тэхналогіі 3-D secure.

Даведка

Тэхналогія 3-D secure выкарыстоўваецца як дадатковы ўзровень бяспекі для анлайн-плацяжоў. Яна дадае яшчэ адзін крок аўтэнтыфікацыі карыстальніка. Гэта, напрыклад, можа быць спецыяльны код, які высылаецца кліенту ў выглядзе СМС-паведамлення на мабільны тэлефон і без увядзення якога ажыццявіць аперацыю ў інтэрнэце немагчыма.

АД ЧАГО ЎРАТУЕ ПРЫНЦЫП НУЛЯВОЙ АДКАЗНАСЦІ?

Адно з апошніх ноу-хау Нацыянальнага банка — рэкамендацыя банкам прытрымлівацца прынцыпу нулявой адказнасці трымальніка банкаўскай карткі. Гэты прынцып у класічным разуменні прадугледжвае тое, што ў выпадку крадзяжу сродкаў з карткі банк пакрывае кліенту суму выкрадзеных сродкаў. Новаўвядзенне павінна павялічыць прывабнасць картак і, адпаведна, безнаяўных разлікаў у краіне. Але і гэта кліента наўрад ці цалкам абароніць.

— Нават прынцып нулявой адказнасці не можа на 100% гарантаваць вяртанне сродкаў банкам у выпадку форс-мажору, — лічыць Аляксандр Сотнікаў. — Пачнём з таго, што цяпер яшчэ не цалкам зразумела, як будзе выглядаць прынцып нулявой адказнасці ў Беларусі. Спецыялісты яшчэ не бачылі фінальнага нарматыўнага дакумента Нацыянальнага банка, таму што яго пакуль не існуе.

Атрымаўшы ў рукі картку ад кліента крамы, касір дакладна фіксавала яе рэквізіты. З іх дапамогай вельмі «разумная касірка» аплачвала тавары і паслугі ў сеціве.

Наогул, прынцып нулявой адказнасці прадугледжвае прэзумпцыю невінаватасці трымальніка. Каб не вяртаць грошы, банк павінен даказаць, што сродкі з карткі былі скрадзеныя па віне кліента. Пры гэтым ён можа ўводзіць пэўныя абмежаванні. Напрыклад, калі ў вас картка з магнітнай паласой, а вы паехалі з ёй за мяжу і там у вас скралі грошы, банк за гэта адказнасці не нясе. Таму што прапаноўваў кліенту аформіць чыпавую картку, але вы не сталі гэтага рабіць. І гэта толькі адна з магчымых агаворак, якія могуць мець месца. Пра рэальную карысць прынцыпу нулявой адказнасці ў Беларусі гаварыць пакуль заўчасна, рэзюміруе спецыяліст.

Такім чынам, самы верны спосаб абараніць сябе ад махлярства — падзяляць віртуальныя і рэальныя фінансавыя патокі. Неабходна мець асобную картку для разлікаў у інтэрнэце і зусім іншую — для паездак за мяжу (абавязкова — з чыпам), а ў банкаматах і крамах на тэрыторыі Беларусі выкарыстоўваць толькі тыя карткі, што не маюць міжнароднай функцыі і не прымаюцца да аплаты тавараў і паслуг праз інтэрнэт. Гэтага будзе цалкам дастаткова для таго, каб ваша безнаяўнае жыццё было сапраўды бяспечным.

* * *

Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефонах 8 (017) 292 38 02 і 8 (017) 287 17 51.

Сяргей КУРКАЧ

Фота БЕЛТА.

■ Факт

Пад'ём цэн абмежавалі

І вытворцы, і гандляры могуць павышаць кошты толькі пры пэўных умовах

Міністэрства гандлю і Міністэрства эканомікі ўнеслі ад сёння змены ў рэкамендаваныя правілы фарміравання (вызначэння) цэн. Адпаведны дакумент падпісаны кіраўнікамі ведамстваў Валянцінам Чаканавым і Уладзімірам Зіноўскім.

Правілы распаўсюджваюцца на юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць па вытворчасці і (або) продажы (пастаўцы) тавараў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку рэзідэнтаў СЭЗ (свабодных эканамічных зон), юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, уключаных у Дзяржаўны рэестр гаспадарчых суб'ектаў, якія займаюць дамінуючае становішча на таварных рынках. Пры гэтым нормы не распаўсюджваюцца на фарміраванне тарыфаў на паслугі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, уключаных у Дзяржаўны рэестр гаспадарчых суб'ектаў, якія займаюць дамінуючае становішча на таварных рынках і якія заключылі дагаворы з антыманапольным органам.

Аднак вытворцам паслуг рэкамендуецца пры фарміраванні тарыфаў кіравацца аналагічнымі падыходамі, як для вытворцаў тавараў.

Такім чынам, фарміраванне цэн на лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння, медыцынскую тэхніку ў сферы абарачэння (аптовым і рознічным звёнах) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нормамі Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2005 г. №366 «Аб фарміраванні цэн на лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння і медыцынскую тэхніку».

А вось павышэнне адпускных цэн (тарыфаў) вытворцамі, падкрэсліваюць у прэс-службе Мінэканомікі, дапускаецца на велічыню змены кошту імпартных сыравіны і матэрыялаў, камплектуючых, тары і ўпакоўкі, што паходзяць з трэціх краін (не ўваходзяць у Еўразійскі эканамічны саюз) і паступілі пасля 18 снежня 2014 года, з улікам іх долі ў адпускной цане. Пры гэтым павелічэнне цэн на сыравіну і матэрыялы, камплектуючыя, тару і ўпакоўку айчыннага паходжання, а таксама з краін ЕАЭС, не дапускаецца. Акрамя гэтага, павышэнне адпускных цэн (тарыфаў) вытворцамі дапускаецца на велічыню змены кошту энерганосьбітаў, паліва, у тым ліку нафтапрадуктаў. Пры гэтым планавы ўзровень рэнтабельнасці не можа перавышаць узровень, які фактычна склаўся па арганізацыі за студзень—верасень 2014 года па гэтым відзе дзейнасці.

На тавары імпарту, якія паступілі пасля 18 снежня 2014-га, дапускаецца павелічэнне адпускной цаны (на момант яе фарміравання) не больш чым на працэнт змены курсу беларускага рубля да валюты дагавора ў параўнанні з 18 снежня мінулага года. Пры гэтым рэнтабельнасць продажу па канчатковым фінансавым выніку не можа перавышаць 3% па гэтым відзе дзейнасці.

«Пры фарміраванні цэн юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія ажыццяўляюць аптовы і рознічны гандаль, дапускаецца прымяненне гандлёвых (аптовых) надбавак па канкрэтных відах тавараў у памерах, якія не перавышаюць узровень на (да) 18 снежня 2014 года (без уліку акцыйных мерапрыемстваў, якія праводзіліся ў снежні мінулага года). Пры гэтым рэнтабельнасць продажаў па канчатковым фінансавым выніку не можа перавышаць 3% у цэлым па арганізацыі», — гаворыцца ў дакуменце.

Рэалізацыя плодаагароднінаў прадукцыі са стабілізацыйных фондаў ажыццяўляецца па рознічных цэнах (адпускных цэнах з улікам гандлёвай надбаўкі), вызначаных рашэннямі аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама на снежань мінулага года.

Гэты ліст ужываецца з 3 лютага, папярэдні ліст Міністэрства гандлю і Міністэрства эканомікі ад 15 студзеня 2015 г. № 03-20/55 і № 05/390 не ўжываецца з названай даты.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Далёкае-блізкае

БРАСЛАЎ «СТАВІЦЬ» НА КЛІМАТ

Чаго далей чакаць у галіне энергаэфектыўнасці?

У Цэнтры экалагічных рашэнняў (ЦЭР) падвялі вынікі энергетычнай кампаніі за два гады і праанансавалі будучыя мерапрыемствы. Сёлета скончыліся праекты па энергаэфектыўнасці і прасоўванні аднаўляльнай энергетыкі ў трох рэгіёнах: Браслаўскі, Шчучынскі і Пухавіцкі раёны атрымалі доўгатэрміновыя бізнес-планы па развіцці, у гарадах праведзены дэманстрацыйныя праекты. У Мінску з'явіўся першы ў краіне цэнтр па энергакансультаванні насельніцтва, паслугамі якога скарысталіся больш як 4 тысячы чалавек.

Дырэктар установы Яўген ЛАБАНАЎ коратка акрэсліў планы арганізацыі:

— Мы зацікаўлены ў развіцці існуючай сістэмы. У бліжэйшыя гады грамадскія цэнтры па энергакансультаванні з'явяцца ў двух абласных гарадах Беларусі. Шмат званкоў нашы спецыялісты атрымліваюць менавіта з рэгіёнаў, таму неабходна рыхтаваць людзей на месцах, якія будуць працаваць, напрыклад, пры выканкамах.

Доўгатэрміновае кліматычнае планаванне будзе працягвацца ў пяці новых раёнах, якія выберуць на конкурснай аснове. Яўген Лабанаў адзначыў, што цяпер ёсць ідэя стварыць для папулярызацыі энергаэфектыўнасці мясцовыя энергетычныя клубы ў рэгіёнах. Акрамя таго, арганізацыя будзе спрыяць развіццю энергетычнага рынку ў Беларусі.

Выказаў сваю думку на гэты конт выканаўчы дырэктар асацыяцыі «Аднаўляльная энергетыка» Уладзімір НІСЦЮК. Па яго словах, грошы з дзяржаўнага бюджэту, якія ўкладваюцца ў аднаўляльную энергетыку, часам выкарыстоўваюцца нерацыянальна. Інвестары, карыстаючыся недасведчанасцю заказчыка, часам падманваюць яго: пастаўляюць няякаснае абсталяванне, затрымліваюць тэрміны, тым самым не даючы магчымасці іншым зрабіць якасную працу.

— Напрыклад, ёсць фірма, якая ўжо тры гады трымае плошчы пад будаўніцтва сонечных электрастанцый у Гомельскай вобласці — дагавор з губернатарам падпісаны, але дзе дзеянні? — абураецца Уладзімір Нісцюк. — Гэта сведчыць пра тое, што ў нас няма вопыту супрацоўніцтва з інвестарамі.

Разам са спецыялістамі Цэнтра экалагічных рашэнняў эксперты збіраюцца правесці «лікбез» для кіраўніцтва і насельніцтва па пытаннях супрацоўніцтва з замежнымі кампаніямі.

Адзін з амбіцыёзных праектаў ЦЭР — зрабіць у Беларусі першы кліматычна нейтральны горад. У якасці эксперыментальнай пляцоўкі выбралі Браслаў, які паспеў паўдзельнічаць у праекце «Энергаэфектыўнасць у рэгіёнах».

— Мы падумалі, што горад справіцца з такімі мэтамі, як выкарыстанне ў кацельнях мясцовых экалагічных відаў паліва, зможа сам выпрацоўваць энергію і выкарыстоўваць больш аднаўляльных крыніц энергіі, — распавядае **кіраўнік энергетычнай праграмы ЦЭР Дзмітрый БУРОНКІН**. — Чаму гэта рэальна менавіта тут? Браслаўскі раён невялікі, у ім адсутнічае энергазатратная прамысловасць. А яшчэ гэты горад з'яўляецца візітнай карткай Беларусі, яго актыўна наведваюць турысты.

Падрыхтоўка праекта па стварэнні кліматычна нейтральнага горада пачалася ў мінулым годзе, у снежні быў падпісаны кантракт, агульная сума бюджэту склала 735 тысяч еўра. Практычная рэалізацыя задуманага запланавана на май. Сярод пастаўленых задач катэгорыі «мінімум» — скараціць на 20% колькасць выкідаў да 2020 года.

— Калі мы выбіралі Браслаў, то падумалі — чаму б экалагічна дружалюбны вобраз горада і кліматычную нейтральнасць не зрабіць яго асноўнай «фішкай»? — тлумачыць Дзмітрый Буронкін.

Адзін з амбіцыёзных праектаў ЦЭР — зрабіць у Беларусі першы кліматычна нейтральны горад. У якасці эксперыментальнай пляцоўкі выбралі Браслаў.

Аднак наперадзе яшчэ шмат працы. Для пачатку плануюцца азнаямляльныя туры для адміністрацыі раёна ў іншыя гарады Еўропы — мяркуецца наладзіць супрацоўніцтва. Вядома, праект не абыдзецца і без грунтоўнага даследавання і аналізу агульнай кліматычнай сітуацыі ў рэгіёне: абавязкова будзе падлічаны энергетычны патэнцыял Браслаўшчыны. Гэтыя звесткі стануць асновай для кліматычнай стратэгіі развіцця да 2030 года.

У Браславе абавязкова з'явіцца агульнакансультацыйны цэнтр па пытаннях энергазберажэння. А яшчэ будзе створаны адмысловы экалагічны маршрут.

— У турыстаў з'явіцца магчымасць не толькі наведаць культурныя і гістарычныя мясціны горада, а і ўбачыць сонечны калектар і энергазберагальныя тэхналогіі, — дзеліцца планамі спецыяліст. — Мы хочам набыць экскурсійны электрамабіль — з ім аповед атрымае свой шарм, і несумненна, пакіне ў гасцей Браслава толькі пазітыўныя эмоцыі.

Спецыялісты вырашылі абсталяваць грамадскія месцы аднаўляльнымі крыніцамі энергіі — напрыклад, зрабіць лаўкі, на якіх можна зараджаць тэлефоны ці камп'ютары.

Ужо сёння пралічваюцца асноўныя мерапрыемствы. Так, салома будзе выкарыстоўвацца як аднаўляльнае паліва — у горадзе ўсталююць спецыяльныя катлы. Ацяпляльныя трубы заменяць на новыя. У дзіцячых садках пачнуць працаваць сонечныя калектары для нагрэву вады. Гарадское асвятленне мала-памалу будзе замяняцца на святлодыёднае. Плануецца ўстанавіць датчыкі гуку і руху ў шматкватэрных дамах. Пералік мерапрыемстваў пакуль прыкладны, бо ўсё будзе залежаць яшчэ і ад вынікаў даследаванняў. Цікава, якім мы ўбачым Браслаў праз дзесяцігоддзе?

Кацярына РАДЗЮК

■ Энергетыка

БІЗНЕСУ — СВЯТЛО!

Спрасціўся парадак падключэння прадпрымальнікаў да электрычных сетак. Далучыць свой бізнес да электраліній можна цяпер па прынцыпе «аднаго акна».

ПЯЦЬ ПРАЦЭДУР У «АДНО АКНО»

Зрабіць гэта можна згодна з указам №397 «Аб тэхналагічным далучэнні электраўстановак», дзе прадугледжваецца арганізацыя працэсу па падключэнні электраўстановак юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў з далучанай магутнасцю да 250 кілавольт-ампер (230 кВт) уключна да электрычных сетак энергазберагальных арганізацый «Белэнерга» напругай 0,4-10 кілавольт. **Вадзім ЗАКРЭЎСКІ, намеснік міністра энергетыкі**, растлумачыў, што раней, каб падключыцца да сістэмы электразабеспячэння, юрыдычным асобам і ІП неабходна было прайсці праз пяць працэдур. Цяпер на падставе заявы энергазабеспячальныя арганізацыі «Белэнерга» будуць аказваць паслугу, якая прадугледжвае ўвесь комплекс работ, неабходных для падключэння электраўстановак да электрычных сетак. Гэта падрыхтоўка тэхнічных умоў, распрацоўка праектнай дакументацыі на электразабеспячэнне, выкананне работ па будаўніцтве (рэканструкцыі) электрычных сетак, падключэнне пабудаваных аб'ектаў электразабеспячэння да сетак і афармленне адпаведных дакументаў. Суб'екты гаспадарання могуць атрымаць у энергазабеспячальнай арганізацыі і тэхнічныя ўмовы, а праектныя і будаўніча-мантажныя работы выканаць з дапамогай профільнага камерцыйнага прадпрыемства. Да энергазабеспячальнай арганізацыі трэба будзе звярнуцца толькі для непасрэднага падключэння да электрычных сетак. Дакументам таксама прадугледжана скарачэнне тэрміну падключэння да сістэмы электразабеспячэння, які раней складаў 131 дзень.

«Для тэхнічнага далучэння, якое прадугледжвае будаўніцтва лініі электрапередачы да 0,5 км і ўстаноўку слупавой, мачтавай або комплекснай трансфарматарнай падстанцыі, тэрмін далучэння не павінен перавышаць 100 каляндарных дзён», — дадаў Вадзім Закрэўскі.

ДЗЕЛАВЫЯ КОЛЫ ЎХВАЛЯЮЦЬ ТЭРМІНЫ

У сваю чаргу прадстаўнікі бізнесу Беларусі лічаць, што крокі дзяржавы па палягчэнні працэдуры падключэння юрыдычных асоб і ІП да сістэмы электразабеспячэння дастаткова канструктыўныя.

«Працэдуры, якія існуюць сёння, прымальныя і па колькасці, і па тэрмінах», — адзначыў **Уладзімір КУНЦЭВІЧ, дырэктар таварыства «ВБА Гама»**.

«Як прадстаўнік арганізацыі, што займаецца праектаваннем сетак электразабеспячэння, пазітыўна гляджу на спрашчэнне працэдур, звязаных з падключэннем да электрычных сетак, якую робіць Міністэрства энергетыкі. Працягваць скарачэнне тэрмінаў падключэння і колькасці працэдур не трэба. Гэта можа адлюстравацца на бяспецы электразабеспячэння, што з'яўляецца недапушчальным», — выказаўся **Ігар ЛЫСАІВАНАЎ, дырэктар фірмы «Энергатэхна»**.

Сусветны банк ацаніў рэйтынг Беларусі па падключэнні да электрычных сетак на ўзроўні 148 месца са 189 краін. Па словах Вадзіма Закрэўскага, за апошні год паказчыкі краіны прасунуліся на 20 месцаў наперад.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■ Грошы

ІНФЛЯЦЫЯ ПАКАЗАЛІ ЯЕ МЕСЦА

Чакаецца адкрыццё валютнага рынку і барацьба з разлікамі ў валюце

Мэтавы арыенцір па інфляцыі ў 2015 годзе вызначаны на ўзроўні 18% з дапушчальным адхіленнем у памеры 2%, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка пасля пашыранага пасяджэння праўлення Нацбанка.

Па выніках мінулага года гэты паказчык значна перавысіў прагнозны параметр і склаў 16,2%. «Запланаваны ўзровень інфляцыі будзе дасягацца шляхам кантролю над грашовай прапановай з боку Нацыянальнага банка, — растлумачылі ў прэс-службе. — Для гэтага будзе ажыццёўлены пераход да рэжыму манетарнага таргетавання». У якасці прамежкавага арыенціру грашова-крэдытнай палітыкі вызначаецца прырост сярэдняй шырокай грашовай масы на ўзроўні не больш за 30% за 2015 год. У якасці аперацыйнага арыенціру грашова-крэдытнай палітыкі вызначаны прырост сярэдняй рублёвай грашовай базы.

У сваю чаргу мэтавыя параметры прыросту сярэдняй рублёвай грашовай базы і сярэдняй шырокай грашовай масы будуць дасягацца з выкарыстаннем інструментаў грашова-крэдытнай палітыкі. Будуць адноўлены рэгулярныя аўкцыёны на адкрытым рынку.

Як было адзначана, на працягу 2014 года развіццё макраэканамічнай сітуацыі насіла складаны і неаднародны характар, што непасрэдна паўплывала на вынікі грашова-крэдытнай палітыкі. «Падзенне коштаў на нафту, дэвальвацыя валют краін — асноўных гандлёвых партнёраў, геапалітычная напружанасць, а таксама кан'юнктурная змена рынкаў аказалі негатыўнае ўздзеянне на развіццё сітуацыі ў эканоміцы Беларусі», — канстатавалі ўдзельнікі пасяджэння.

Дарэчы, Нацбанк таксама разгледзіць прапановы па скарачэнні выкарыстання валюты пры разліках у Беларусі. У працэсе выканання стратэгічнай задачы па дэдаларызацыі эканомікі і павышэнні даверу да нацыянальнай валюты праўленне Нацбанка разгледзіць прапановы па скарачэнні выпадкаў выкарыстання замежнай валюты, каштоўных папер і плацежных дакументаў у замежнай валюце пры разліках на тэрыторыі Беларусі.

Важна і тое, што плануецца забяспечыць поўнае адкрыццё пазабіржавога валютнага рынку, а таксама змена рэжыму біржавых таргоў на бесперапынны двайны аўкцыён. «У бліжэйшы час будзе разгледжана пытанне аб зняцці абмежаванняў на ажыццяўленне куплі-продажу замежнай валюты на пазабіржавым валютным рынку», — адзначылі ў прэс-службе Нацбанка. А курсавую палітыку на 2015 год ахарактарызавалі так: «Яна будзе спрыяць згладжванню рэзкіх ваганняў абменнага курсу беларускага рубля, пры гэтым захаваюцца жорсткія падыходы да выкарыстання золата-валютных рэзерваў для правядзення валютных інтэрвенцый».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Нішто сабе

Пасуньцеся: «французы» едуць

На рынак паступілі 80 айчынных «Пежо»

Учора стартавалі продажы аўтамабіляў Peugeot беларускай вытворчасці. Гэта седан сярэдняга класа Peugeot 301 і рэстайлінгавы красовер Peugeot 3008. У сакавіку вытворцы плануюць пачаць продажы Peugeot Partner і новага рэстайлінгавага бізнес-седана Peugeot 508, а таксама дзвюх мадэляў Citroën — C-Elysee і Berlingo.

Аўтамабілі канцэрна Peugeot-Citroën збіраюць на заводзе «Юнісан». Прадпрыемства ўжо рэалізавала некалькі праектаў па вытворчасці аўтамабіляў, такіх як Ford, Lublin, Samand, Zotye. Продажы аўтамабіляў ажыццяўляюцца праз дылерскія цэнтры Peugeot і Citroen у Беларусі. Кошт седана Peugeot 301 складзе каля 182 млн беларускіх рублёў (ад 11 800 долараў па актуальным курсе), рэстайлінгавы красовер Peugeot 3008 — каля 314 млн рублёў (ад 20350 долараў). У кампаніі «ПС АЎТА ГРУП», якая з'яўляецца афіцыйным імпарцёрам Peugeot і Citroën у Беларусі, адзначылі, што цэны на аўтамабілі беларускай зборкі сталі ніжэйшымі. Дылеры таксама разлічваюць на тое, што аўтамабілямі зацікавяцца і дзяржаўныя ўстановы — усе яны адпавядаюць правілам набыцця службовых аўтамабіляў згодна з указам № 119.

«Каля паловы года пайшло на тое, каб правесці ўсе падрыхтоўчыя работы па запуску гэтага праекта. Патрабаванні да працэсу зборкі цалкам адпавядаюць жорсткім еўрапейскім стандартам. Ключавыя супрацоўнікі прадпрыемства прайшлі абавязковую адукацыю на заводах PSA Peugeot Citroen у Францыі і Расіі. Канцэрн пастаянна дапамагаў у арганізацыі зборкі аўтамабіляў. Іх прадстаўнікі ўвесь час знаходзяцца на прадпрыемстве. Тэхнічная падтрымка была на ўсіх этапах і працягваецца да гэтага часу. Сабрана ўжо 80 аўтамабіляў, і яны паступаюць у продаж дылерскай сеткі Беларусі», — расказаў **дырэктар вытворчага прадпрыемства «Юнісан» Валянцін Пікуль**. Пашырыцца і дылерская сетка — у першым квартале гэтага года плануюць адкрыць новыя цэнтры ў Гомелі і Віцебску.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■ Стыхія

Падтапіла талымі водамі

Калі не зазіраць у каляндар, складваецца ўражанне, што зараз за акном сакавік. Факты гэта толькі пацвярджаюць, бо ў выніку вялікага раставання снегу на тэрыторыі краіны былі падтоплены два адміністрацыйныя будынкі, 32 жылыя дамы, 30 падворкаў, 6 гаспадарчых пабудоў і тры ўчасткі аўтамабільных дарог у 19 населеных пунктах Віцебскай, Гомельскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей.

Паводле інфармацыі МНС, пацярпелых няма, жыццезабеспячэнне насельніцтва не парушана. Для ліквідацыі наступстваў падтапленняў прыцягваліся 26 адзінак тэхнікі і 87 чалавек, з іх 19 адзінак тэхнікі і 59 работнікаў МНС.

Найбольш ад зімовага цяпла пацярпелі населеныя пункты ў Магілёўскай вобласці. Тут талымі водамі падтапіла 21 падвал жылых дамоў, 22 падворкі, два падвалы адміністрацыйных будынкаў, а таксама тры ўчасткі аўтамабільных дарог у Магілёве, аднак рух транспарту пры гэтым не спыняўся.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Здарэнні

З ДАІ — ЗА КРАТЫ

Былы супрацоўнік Дзяржаўтаінспекцыі правядзе 4 гады ў калоніі ўзмоцненага рэжыму — пакаранне за хабар у памеры 1000 долараў. У асуджанага таксама канфіскавалі маёмасць.

— Летась крымінальная справа была заведзена ў дачыненні толькі да аднаго міліцыянера Віцебшчыны: старшага лейтэнанта, супрацоўніка ДАІ. У апошні дзень фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» ён атрымаў хабар — 1000 долараў. Немалады ўжо чалавек, служыў даўно. І ўсё ў яго жыцці было ў парадку: меў і кватэру, з жонкай выхоўваў дзіця. Арыштавалі на тэрыторыі ўпраўлення ДАІ, калі яго на той час яшчэ калегі заступалі на службу. А судзілі ў будынку Упраўлення ўнутраных спраў. Такім чынам адбыўся паказальны суд, — паведаміў **Ігар ЯЎСЕЕЎ, начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама.**

Паводле яго слоў, выяўляць нячыстых на руку міліцыянераў дапамагаюць супрацоўнікі КДБ.

Яшчэ пазбавілі пагонаў траіх міліцыянераў, якія кіравалі аўто ў нецвярозым стане. Для параўнання, пазалетась былі выяўлены чатыры факты язды пасля ўжывання алкаголю. Зразумела, гэтыя супрацоўнікі ніколі ўжо не змогуць працаваць у праваахоўных органах.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

«ЛІПАВАЯ» ВАГА

У дачыненні да былога старшыні СВК «Саўбел», што ў Смаргонскім раёне, завялі крымінальную справу.

Злоўжываючы службовымі паўнамоцтвамі, ён даваў указанні падначаленым прыпісваць у афіцыйных дакументах вагу жывёлы. Тым самым сельгаспрадпрыемства панесла страты на суму 73,6 мільёна рублёў у выглядзе неабгрунтавана выплачанай зарплаты. Да крымінальнай справы прывялі таксама прыпіскі вагі свіней на ферме «Тулава» СВК «Міжэрычы» Зэльвенскага раёна. У пракуратуры Гродзенскай вобласці адзначылі, што гэтыя парушэнні выявілі, дзякуючы ўзаемадзеянню з аблвыканкамам. Менавіта адтуль паступіла просьба праверыць вышэйзгаданыя сельгаспрадпрыемствы.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■

Управляющий ЧТПУП «Меватек-Бел» – ИП Кудренок Е.А. организатор торгов, извещает о проведении 06 марта 2015 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8-25 открытых торгов в форме аукциона (на повыш. нач. цены)

по продаже имущества, бывшего в употреблении общей стоимостью 57 755 300 рублей (деловые отходы из картона, фотополимерные печатные формы, штанцевые формы, штампы вырубные),

шаг торгов – 5% от первоначальной цены, задаток – 10% от первоначальной цены.

Ознакомление с составом лотов, формой заявления на участие в торгах и др. сведениями на сайте **http://kudrenok.by, http://bankrot.gov.by.** Здесь же ознакомление с формой заявки, договором и др. документами. **Место нахождения имущества – г. Молодечно, пер. Заслонова, 3.**
Прием заявлений на участие в торгах по почтовому адресу: **220019, Минск-19, а/я 29, Кудренок Е.А.,** с даты настоящей публикации **до 11.00 05.03.2015 г.,** тел. в г. Минске: /8-029/644-38-92.
Оплата производится с даты настоящей публикации до 05.03.2015 г. на р/с 3012133750013 в ОАО «Технобанк», г. Минск, МФО 153001182, УНП 191379116.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в теч. 3 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в теч. 5 календ. дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

Управляющий ООО «Анделико» – ИП Кудренок Е.А. организатор торгов, извещает о проведении 06 марта 2015 года в 09.00 по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8-25 открытых торгов в форме аукциона (на повыш. нач. цены) по продаже имущества, бывшего в употреблении общей стоимостью 115 992 300 рублей одним лотом

(Кофеавтоматы CAFITESSE 120/B40F S (Occasion) 22 шт., подводки для воды, подносы, тумбы),

шаг торгов – 5% от первоначальной цены, задаток – 10% от первоначальной цены в размере 11 599 230 рублей.

Ознакомление с составом лота, формой заявления на участие в торгах и др. сведениями на сайте **http://kudrenok.by, http://bankrot.gov.by**. Здесь же ознакомление с формой заявки, договором и др. документами. **Место нахождения имущества – Минская обл., пересечение Логойского тракта и МКАД, административное здание.**
Прием заявлений на участие в торгах по почтовому адресу: **220019, Минск-19, а/я 29, Кудренок Е.А.,** с даты настоящей публикации **до 09.00 05.03.2015 г.**, тел. в г. Минске: /8-029/644-38-92.
Оплата производится с даты настоящей публикации до 05.03.2015 г. на р/с 3012022888019 в ЗАО «ПриорБанк», г. Минск, МФО 153001749, УНП 191197302.
Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения имущества по сравнению с предложениями других участников. Заключение договора купли-продажи осуществляется в теч. 3 раб. дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в теч. 5 календ. дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее, чем за один день до их проведения.

Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0635011, квитанция о приеме наличных денежных средств формы 1 СУ серии КС № 3959947 **считать недействительными.**

УНП 100706519

ОАО «НАФТАН» РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ
(с повышением начальной цены)

БЫВШЕЕ В УПОТРЕБЛЕНИИ НЕИСПОЛЬЗУЕМОЕ ИМУЩЕСТВО:

Наименование конкурса (пометка на конверте)	Наименование	Инв. №	Год выпуска	Начальная цена с НДС, руб. РБ
Реализация неликвидов. Автотехника.	Мерседес-Бенц S350L, гос. № 0011 ВАА	13150756	2006	270 000 000
	Фольксваген Туарег V10, гос. № 0193 АЕ-2	13150699	2004	172 800 000
	Фольксваген Пассат, гос. № 5333 ВТ	13150555	2000	55 476 000
	Опель-Астра, гос. № 5801 АВ-2	13151043	2004	76 500 000
	Опель-Астра, гос. № 5802 АВ-2	13151046	2004	76 500 000
	Опель-Астра, гос. № 5803 АВ-2	13151049	2004	76 500 000
	Опель-Астра, гос. № 5804 АВ-2	13151052	2004	76 500 000
	Опель-Астра, гос. № 5805 АВ-2	13151055	2004	76 500 000
	Автомобиль ВАЗ-21310-126 (Нива), гос. № 6343 АК-2	13150722	2005	34 020 000
	МАЗ 13150(Автобус), гос. № АА 6092-2	13150809	2006	854 400 000
	МАЗ 13150(Автобус), гос. № АА 0263-2	13151093	2005	576 000 000
	Полуприцеп цистерна ППЦ 22 МАЗ 9919-012, гос. № В 0696 А	13150716	2005	159 120 000
	Мерседес Бенц Спринтер 412Д	13150530	1996	96 720 000
	ВАЗ-210430	13150654	2003	10 584 000
	ВАЗ-21093	13150649	2003	9 600 000
	ВАЗ-21093	13150602	2002	7 200 000
	ВАЗ-21093	13150603	2002	7 200 000
	ВАЗ-21093	13150599	2002	7 200 000
	ВИС-2345	13150610	2001	7 800 000
	Автомобиль МАЗ 54323-032	13151245	1995	45 600 000
	МАЗ 6317-05(Экскаватор), гос. № АА2494-2	04150924	2006	362 880 000
	МАЗ 631705(Экскаватор-планировщик), гос. № АА 2864-2,	04150930	2006	362 880 000
	Полуприцеп "Ванхоол" S-301, гос. № А 0766А-2	13151233	1992	241 200 000
	Полуприцеп "Ванхоол" S-301, гос. № А 0781А-2, г.в. 1992	13151232	1992	241 200 000
	Полуприцеп МАЗ 9758-012	13150621	2002	26 280 000
	Мини-трактор АМЖК-8 в комплекте с навесным оборудованием (плуг, окучник, прицеп)	04000042	1998	18 600 000
	ВАЗ-21043, гос. № 5363 ВТ	13150822	2001	14 580 000
	МАЗ 447143 (мусоровоз), гос. № АІ 5031-2	13151308	2013	522 000 000
	Фольксваген Пассат В5 4х4, гос. № 9134 ВТ	13150664	2003	92 400 000
	Фольксваген Пассат В5, гос. № 5334 ВТ	13150556	2000	55 200 000
	Фольксваген Пассат В5, гос. № 4257 ВХ-2	13150609	2002	75 000 000
	Шкода Октавия А5 1,6л. Элеганс, гос. № 2841 АР-2	13150768	2006	75 600 000
	Шкода Октавия А4 1,8л классик, гос. № 9900 АІ-2	13150708	2005	75 600 000
	Шкода Октавия А5 1,6л. Элеганс, гос. № 2845 АР-2	13150761	2006	75 600 000
	Шкода Октавия А5 1,6л. Элеганс, гос. № 4437 АІ-2	13150707	2005	75 600 000
	Шкода Октавия А5 1,6л. Элеганс, гос. № 2839 АР-2	13150767	2006	75 600 000
	Шкода Октавия А5 1,6л. Элеганс, гос. № 2843 АР-2	13150765	2006	75 600 000
	Шкода Октавия А5 1,6л. Элеганс, гос. № 2842 АР-2	13150760	2006	75 600 000
	ВАЗ 2123 (Шевроле Нива), гос. № 3737АІ-2	13150827	2005	51 600 000
	Шевроле Нива 212300, гос. № 5515 АВ-2	13150696	2004	48 000 000
	ВАЗ 2123000 (Шевроле Нива GLS), гос. № 7575 АН-2	13150748	2006	65 400 000
	УАЗ 39099,гос. № АА 1367-2	13150720	2005	42 000 000

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 5 марта 2015 года с пометками на конверте, указанными в таблице.
Извещения на проведение конкурса размещены на сайте www.naftan.by.
Контактные телефоны: 8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, (033) 398 08 48, (033) 398 07 67.

УНП 300042199

Узденский районный исполнительный комитет
9 марта 2015 г. в 10.00
по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) проводит аукцион

ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ В АРЕНДУ ОХОТНИЧЬИХ УГОДИЙ
фонда запаса Узденского района одного обособленного участка

Аукцион будет проходить в порядке, определенном пунктом 17 Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 20 января 2015 г. № 26.

Общая площадь обособленного участка составляет 20 200 га (угодья: лесные 7 200 га, полевые 11 100 га, водно-болотные 1 900 га) в границах:

на севере – от 37 километра автомобильной дороги Р-23 Минск–Слуцк–Микашевичи по дороге через деревню Яченка до деревни Теплень, далее на юго-восток по мелиоративному каналу до административной границы Пуховичского района (северная граница квартала №22 Валерьяновского лесничества ГЛХУ «Узденский лесхоз»);

на востоке – по административной границе Пуховичского района на юг до административной границы Слуцкого района;

на юге – по административной границе Слуцкого района на запад до автомобильной дороги Р-23 Минск–Слуцк–Микашевичи;

на западе – по автомобильной дороге Р-23 Минск–Слуцк–Микашевичи на север до 37 километра указанной дороги.

Минский областной исполнительный комитет в течение пяти рабочих дней после согласования Министерством лесного хозяйства и территориальными органами Министерства природных ресурсов и охраны окружающей среды биолого-экономического обоснования охотничьих угодий и проекта решения о предоставлении охотничьих угодий в аренду принимает решение о предоставлении охотничьих угодий в аренду и заключает с юридическим лицом договор аренды охотничьих угодий.

Начальная цена объекта аукциона – 37 620 000 белорусских рублей.

Задаток в размере 20% начальной цены объекта аукциона составляет 7 524 000 белорусских рублей, вносится в срок не позднее 4 марта 2015 г. путем безналичного расчета платежным поручением на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области № 3600631002518 в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа 04003.

Участник, выигравший аукцион, в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает путем безналичного расчета платежным поручением на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области № 3600631002518 в ЦБУ №625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа 4616 затраты на организацию и проведение аукциона – сумму оплаты за опубликование в средстве массовой информации извещения о проводимом аукционе.

Участникам, не выигравшим аукцион, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона.

Адрес секретаря комиссии: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет №110 (1-й этаж) Узденского райисполкома, контактный телефон 8-(01718)-65-4-37.

Порядок предварительного ознакомления с расположением охотничьих угодий претендентами на участие в аукционе осуществляется по карте, имеющейся у секретаря комиссии в кабинете №110 Узденского райисполкома.

Для участия в аукционе юридическое лицо представляет следующие документы:

- заявление о предоставлении охотничьих угодий в аренду, в котором указываются сведения об охотничьих угодьях, которые участники аукциона желают получить по результатам торгов;
- заверенные копии учредительных документов (свидетельства о регистрации юридического лица и Устава);
- биолого-экономическое обоснование на испрашиваемые в аренду охотничьи угодья, оформленные с учетом требований законодательства;
- заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающего внесение суммы задатка;
- доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.

Документы для участия в аукционе принимаются в Узденском райисполкоме по адресу: **223411, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет №110,** контактный телефон **8-(01718)-65-4-37.**

Окончательный срок приема документов – 6 марта 2015 г.

Минский областной исполнительный комитет после выполнения требований пункта 18 Правил ведения охотничьего хозяйства и охоты, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 г. № 580 (в редакции Указа Президента Республики Беларусь от 5 декабря 2013 г. № 551), заключает с победителем аукциона договор на условиях, определенных в договоре аренды охотничьих угодий, сроком на 10 лет.

С проектом договора аренды охотничьих угодий можно ознакомиться на официальном интернет-сайте Узденского райисполкома: **http://www.uzda.minsk-region.by.**

В **суд Речицкого района Гомельской области** поступило заявление о признании безвестно отсутствующим гражданина ВОЗНОГО Михаила Николаевича, 19.11.1966 года рождения, уроженца Украины, проживавшего по последнему известному адресу: Гомельская область, г. Речица, ул. 5 М-н, 3/76.

Просьба ко всем гражданам и юридическим лицам сообщить в суд Речицкого района Гомельской области имеющиеся сведения о Возном Михаиле Николаевиче в течение 2-х месяцев с момента публикации.

70 ГОД 1945-2015 Вялікай Перамогі

БРАНЯПОЕЗД АРШАНСКІ

Краязнаўца Эдуард Навагонскі распавёў карэспандэнту «Звязды» малавядомы факт вайны. Аказваецца, браняпоезд, які быў у падначаленні Народнага камісарыята ўнутраных спраў, у перадваенныя гады дыслацыраваўся ў Оршы.

Браніраваны цягнік.

Эдуард Эдуардавіч стараецца ўстанавіць імёны і прозвішчы членаў экіпажа таго браняпоезда. Пакуль вядомыя прозвішчы двух загінулых. Каб папоўніць спіс, краязнавец ужо накіраваў запыты ў Калужскую і Арлоўскую вобласці. Ёсць надзея на дапамогу ў гэтым супрацоўнікаў іншых архіваў; навукоўцаў, якія даследуюць тэму вайны; сваякоў знікłых без вестак, загінулых.

Барацьба бронепаяздоў з праціўнікам за рэдкім выпадкам пакуль так і застаецца пакрытай таямніцай. Мо яшчэ і таму, што ў большасці з іх лёс трагічны... Дарэчы, і кінафільмаў пра такія цягнікі не так ужо і шмат. Адзін з самых вядомых — «Наш браняпоезд», які ў 1988 годзе зняў вядомы беларускі кінарэжысёр, акцёр, прадзюсар Міхаіл Пташук.

— Паколькі захапляюся здыманнем дакументальнага кіно, маю намер стварыць фільм «Семдзесят шосты з сорак першага». Там будзе расказваецца пра тое, што ідзе ўсяго толькі другі дзень Вялікай Айчыннай, полчышчы танкаў Гудэрыяна рвуцца на ўсход, клінамі рассякаючы войскі Заходняй асобай ваеннай акругі Чырвонай Арміі. Іх мэта — Масква...

23 чэрвеня 1941 года ў 8 гадзін 45 хвілін начальнік Галоўнага ўпраўлення войскаў НКУС СССР генерал-маёр Аляксандр Іванавіч Гуляеў аддае загад выкарыстаць у барацьбе з ворагам бронепаязды... А на наступны дзень экіпажу навучальнага 76-га браняпоезда ставяць новую задачу. Трэба было адправіцца ў кірунку Маладзечна і ва ўзаемадзеянні з 9 дывізіяй НКУС па ахове чыгунак, штаб якой размяшчаўся ў Вільні, увайсці ў гэты горад і там арганізаваць абарону аб'ектаў. Але... У гэты час камандаванню 3-й дывізіі НКУС па ахове чыгунак, куды ўваходзіў і 76-ы полк, было толькі вядома, што 76-ы браняпоезд знаходзіцца недзе на захадзе ад Мінска. Сувязь з экіпажам была страчана, — расказвае краязнавец.

У першыя дні вайны ў падобным становішчы апынуліся дзесяць браніраваных цягнікоў дывізій унутраных войскаў НКУС па ахове чыгунак. Яны ў Беларусі аднымі з першых уступілі ў бітву з надыходзячымі гітлераўскімі дывізіямі групы «Цэнтр».

— Кожная дывізія НКУС па ахове чыгунак ад Далёкага Усходу да заходніх межаў СССР была ўкамплектавана і браніраваным цягніком. Паводле розных крыніц, у перадваенныя гады ў складзе браняпоезда быў паравоз, пакрыты бранёй, ад двух да чатырох мотаброневаганаў, браніраваны вагон-склад, а таксама вагон-майстэрня і кухня. Экіпаж налічваў каля 130 вайскоўцаў. На ўзбраенні было 4-8 кароткаствольных гармат узору 1902 года ці 1927-1932 гадоў калібру 7,62 міліметра з далёкасцю стральбы да 8 кіламетраў. А яшчэ браніраваныя цягнікі мелі станковыя кулямёты сістэм «Максім», «Дзегцяроў танкавы» і бельгійскі «Браўнінг», якія ўсталёўваліся ў спецыяльных амбразурах. Для супрацьпаветранай абароны таксама было да васьмі зенітных установак: кожная з чатырох сабраных разам «Максімаў», — расказвае нюансы Эдуард Эдуардавіч.

Цікава, што мотаброневаганы ўяўлялі сабой самаходныя чыгуначныя машыны. Апошнія маглі прымяняцца як у складзе браняпоезда, так і рухацца самастойна...

— Менавіта такі мотаброневаган, як мяркуецца, з 76-га браняпоезда, быў падбіты ў баі 27 чэрвеня 1941-га паміж Смалявічамі і Жодзіна...

Я звязаўся з расійскім гісторыкам і журналістам Раманам Нікіціным, які расказаў шмат падрабязнасцяў пра браніраваны цягнік, які ваяваў у Беларусі, — расказвае краязнавец.

Паколькі большасць архіўных фондаў НКУС да гэтага часу закрыты для масавага карыстання, энтузіясты здолелі аднавіць толькі некаторыя эпізоды з жыцця экіпажа навучальнага браняпоезда 76-га палка НКУС. Паводле расказаў старажылаў Оршы і краязнаўцаў, у перадваенныя гады ён дыслацыраваўся ў горадзе над Дняпром.

— Я зрабіў відэасюжэт пра чыгуначную станцыю Орша-Таварная (цяпер Орша-Заходняя), якая была ўтворана яшчэ ў дарэвалюцыйны час, і размясціў у інтэрнэце. Яго прагледзеў адзін з карыстальнікаў, які паведаміў, што, са слоў яго дзеда, у перадваенны час на чыгуначнай станцыі знаходзілася нейкая воінская часць НКУС. Канвойная або па ахове чыгунак... Вывучыўшы карту Генеральнага штаба Чырвонай арміі, выдадзеную ў 1938 годзе, у мяне і маіх аднадумцаў з'явілася здагадка, што ў лесе на гэтай станцыі маглі размяшчацца некаторыя падраздзяленні 76-га палка НКУС... Чаму? На той карце відаць, што ад асноўнага пуці ў раёне перадваеннай чыгуначнай бальніцы пракладзены яшчэ два. Адзін з іх вёў прыкладна да месца знаходжання машынна-трактарнай станцыі. А другі — на край лесу, дзе ў перадваенныя гады знаходзіўся гарадок вайсковай часці. Пра гэта расказаў жыхар Оршы, які добра памятае перадваенныя гады. Ці была пабудаваная для браніраванага цягніка гэтая другая чыгуначная ветка? — разважае Эдуард Эдуардавіч.

Аршанскі краязнавец Віктар Лютынскі знайшоў тэкст радыёграмы за 1942 год, якую адправіў Васіль Бойка, камбрыг партызанскай брыгады. У ёй паведамляецца, што ў лесе за ваенным гарадком 76-га палка НКУС знаходзіцца склад боепрыпасаў.

— Дакладна вядома, што ў перадваенны час у лесе на станцыі Орша-Заходняя быў ваенны гарадок некаторых структурных падраздзяленняў 76-га палка НКУС па ахове чыгунак. Але ці знаходзіўся тут і навучальны браняпоезд гэтага палка? — расказвае Віктар Лютынскі.

Помнік-макет ва Украіне.

Канчаткова раскрыць тайну дапамог Віктар Баброў, які ў перадваенны час пражываў на станцыі Орша-Заходняя. Яму напярэдадні вайны было дзевяць гадоў. Ён бачыў, як на станцыі, дзе сёння размешчана бальніца, у вароты ваеннага гарадка заязджаў браніраваны паравоз, а напярэдзе была платформа.

У выніку краязнаўцам удалося аднавіць падзеі. З Оршы на сваё першае баявое заданне ўжо на наступны дзень пасля пачатку вайны адправіўся экіпаж навучальнага браняпоезда 76-га палка НКУС. А 26 чэрвеня 1941 года побач са станцыяй Чырвоны Сцяг той цягнік прыняў першы бой. Экіпаж вывеў са строю 11 танкаў, бензінавы запраўшчык, тры кулямёты, збіты самалёт і знішчыў вялікую колькасць нямецкіх салдат. Менавіта за гэты бой камандзір браняпоезда капітан Кананенка і камісар Карасцялёў узнагароджаны ордэнам Чырвонага сцяга.

Потым браняпоезд змагаўся з ворагам пад Бранскам... Падчас аднаго з абстрэлаў з гармат цягніка было выпушчана каля 500 снарадаў! Калі штаб арміі, якому падпарадкоўваўся браняпоезд, трапіў у акружэнне, састаў загадалі знішчыць, а экіпажу прабівацца да сваіх.

На постсавецкай прасторы ёсць унікальны помнік браніраванаму цягніку часоў Другой сусветнай вайны. Гэта макет, усталяваны ва ўкраінскім горадзе Канеў...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Орша — Віцебск.

■ «Зваротная сувязь»

ЦЁПЛАЕ ПРЫВІТАННЕ З ХАЛОДНАЙ СІБІРЫ

1 лютага, у дзень народзінаў афіцыйнай старонкі газеты «Звязда» ў сетцы Facebook, рэдакцыя атрымала шмат віншаванняў і цёплых слоў ад сваіх падпісчыкаў. Так, мы даведаліся, што геаграфія нашых чытачоў вельмі шырокая і нас чытаюць нават у далёкай Сібіры. «Віншуем з юбілеем, жадаем шмат чытачоў, такіх як беларусы Сібіры», — піша на старонцы «Звязды» ў Facebook Аляксандр Лагуценка.

Беларусы Сібіры праводзяць дзень роднай мовы і чытаюць па-беларуску нават кітайскім студэнтам.

Жадаем усім добрых навін і настрою, будзьце аператыўна ў курсе ўсіх важных падзей на нашай старонцы ў Facebook па спасылцы **facebook.com/ZviazdA.bypress.**

«ЗОРНЫ ПАХОД» ЗАВІТАЎ У АСІПОВІЧЫ

Студэнты і выкладчыкі сталічнай ВНУ падымаюць прэстыж настаўніцкай прафесіі

Свой юбілейны 50-ы паход студэнты і выкладчыкі Мінскага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка прысвяцілі 70-годдзю Перамогі над фашысцкай Германіяй. Традыцыйна ён праходзіць па месцах баявой і працоўнай славы розных абласцей краіны і схема яго маршруту нагадвае зорку. На гэты раз адной з граняў зоркі стане менавіта Асіповіцкі край. Праграма 4 дзён уключае сустрэчы з ветэранамі і моладдзю раёна, правядзенне канцэртаў і спартыўных мерапрыемстваў, арганізацыю майстар-класаў і прафарыентацыйных размоў.

— Такія сустрэчы ўзаемна нас абагачаюць, дапамагаюць падымаць прэстыж настаўніцкай прафесіі сярод моладзі, заахвочваюць яе сеяць добрае, светлае, вечнае, — кажа **начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму Асіповіцкага райвыканкама Наталля ШАЎЧЭНКА**. —У раёне працуе 128 выпускнікоў гэтага ўніверсітэта, 12 з іх з'яўляюцца кіраўнікамі ўстаноў адукацыі, 15 — намеснікамі. На розных факультэтах і курсах універсітэта вучацца 40 нашых былых навучэнцаў, а са 144 леташніх выпускнікоў, якія паступілі ў розныя ВНУ, 11 выбралі менавіта ўніверсітэт імя М. Танка.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Робім свята разам

Павіншуй родную школу!

Нацыянальны інстытут адукацыі даў старт новаму інтэрнэт-праекту пад назвай «Зробім свята разам», прымеркаванаму да вечара сустрэч выпускнікоў, які адбудзецца ўжо ў наступную суботу. Аддзячыць роднай школе на словах ці матэрыяльна цяпер можа кожны выпускнік.

У межах праекта ўсім ахвотным прапануецца пакінуць словы ўдзячнасці настаўнікам сваёй роднай школы на сайце vseti.by (былая беларуская сацыяльная сетка). Усе віншаванні разам з нумарамі школ-адрасатаў адлюстроўваюцца на галоўнай старонцы сайта. Таксама ёсць магчымасць пералічыць любую суму грошай на пазабюджэтны рахунак сваёй школы. Імёны ахвяравальнікаў таксама з'явяцца на сайце vseti.by.

— Галоўная «фішка» гэтай акцыі — інфармацыя пра яе распаўсюджваецца праз сацыяльныя сеткі пры дапамозе знятага намі «віруснага» ролика, — распавёў карэспандэнту «Звязды» **Сяргей АЛЬШЭЎСКІ, начальнік упраўлення арганізацыйнага суправаджэння дыстанцыйных адукацыйных паслуг Нацыянальнага інстытута адукацыі**. — Агульная сума пералічаных на кошт школ сродкаў адлюстроўваецца на сайце vseti.by. Цяпер застаецца толькі чакаць актыўнага ўдзелу выпускнікоў у акцыі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

МІРСКАЙ БАТЛЕЙЦЫ — ЖЫЦЬ!

Адроджана даўняя мясцовая традыцыя лялечнага тэатра

Артысты з Мірскага каледжа паказалі сваю батлейку ў Прэзідэнцкай бібліятэцы.

Давялося нядаўна пабачыць батлеечную інтэрмедыю (камічную сцэну), якую паставілі навучэнцы Мірскага мастацкага прафесійна-тэхнічнага каледжа. І такой цеплынёй павеяла ад гэтай пастаноўкі, так добра і светла стала ўнутры пасля яе прагляду… У чым сакрэт кранальнасці, можаце спытаць вы. Адкажу, што справа, відаць, не толькі ў шчырасці маладых артыстаў, але і ў тым, што яны адрадзілі тую батлейку, якая ў гарадскім пасёлку Мір існавала на працягу некалькіх стагоддзяў. Сапраўднае, непадробнае — ні з чым не пераблытаеш.

Цяпер на чале гэтага самабытнага тэатра стаіць **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце, выкладчык хіміі і біялогіі Мірскага каледжа Канстанцін ПЕТРЫМАН.** Ён прыехаў працаваць у гэту навучальную ўстанову, калі тут ужо тры гады існаваў батлеечны тэатр. І адразу стаў яго апантаным удзельнікам. Адзначае, што, калі тэатрам кіравалі такія таленавітыя людзі як Галіна Жаровіна і Ганна Выгонная, не ўлюбіцца ў батлейку было проста немагчыма. Цяпер без гэтай справы свайго жыцця ён не ўяўляе. «Гісторыя — гэта маё хобі, якое стаіць на першым месцы (пасля біялогіі і хіміі)», — тлумачыць сваё захапленне Канстанцін Петрыман.

Кіраўнік тэатра распавёў, што традыцыі батлеечнага тэатра ў Міры досыць даўнія:

— Задакументаваных звестак пра раннюю батлейку ў Міры не захавалася. Але гэта зразумела, бо тэатр быў народным, Радзівілы пра яго не дбалі. Але пра тое, што батлейка ў нас была здаўна, сведчыць тое, што ў сям'і Сілко гэта тэатральная традыцыя перадавалася з пакалення ў пакаленне… У XIX — пачатку XX стагоддзя батлейка ў Міры функцыянавала досыць інтэнсіўна: адрэстаўраваная намі інтэрмедыя «Салдат і чорт» была створана ў 1915–1916 гадах. На базарнай плошчы спачатку зазывалі на прадстаўленне, а пасля ў хаце яго давалі. Гэта адбывалася толькі ў калядную пару — у іншы час такой забавы не было. Апошняе прадстаўленне батлеечнікаў у Міры было ў 1950-х гадах — яго ладзілі браты Сілко. На гэтым традыцыя спынілася. Аднак дзякуючы культуролагу Галіне Жаровінай батлейка пачала адраджацца ў 1988 годзе.

Батлейка — гэта людзі з маленькімі цацкамі, а батлей — чалавек, які сваім знешнім выглядам нагадвае ляльку.

Традыцыйнага календара мірскія выступоўцы сёння таксама імкнуцца прытрымлівацца. Асноўныя прадстаўленні адбываюцца з 25 снежня па 19 студзеня (свята Хрышчэння). Калі ж дзесьці запрашаюць выступіць у іншы час, таксама згаджаюцца, каб даць людзям уяўленне пра тое, як увогуле калісьці выглядаў батлеечны тэатр.

У найбліжэйшы час плануецца аднавіць традыцыі калядавання, што называліся калісьці Батлеі. Батлейка — гэта людзі з маленькімі цацкамі, а батлей — чалавек, які сваім знешнім выглядам нагадвае ляльку, адзначае Петрыман. Людзі-лялькі будуць насіць з сабою таксама і маленькую батлейку: у адной асобе можна будзе ўбачыць і лялькавода, і ляльку.

Кіраўнік тэатра адзначае, што аднаўленне п'ес — таксама справа няпростая:

— Даводзіцца размаўляць са старымі людзьмі, якія нешта памятаюць. Дзякаваць Богу, я заспеў яшчэ некалькі чалавек у Міры і навакольлі, што былі на тых славутых мірскіх кірмашах. І яны ўзгадвалі, як на калядных базарах выступалі батлеечнікі. Па такіх невялічкіх успамінах, па драбніцах мы аднаўляем нашу батлейку. Гэта і праца з архіўнымі дакументамі, з мясцовымі дыялектамі — каб правільна перадаць гаворку месца і не парушыць моўны малюнак.

Адрэстаўраваная інтэрмедыя «Салдат і чорт» была створана ў 1915–1916 гадах. На базарнай плошчы спачатку зазывалі на прадстаўленне, а пасля ў хаце яго давалі.

Увесь тэатральны рэквізіт таксама робяць навучэнцы каледжа. Дарэчы, іх батлейка (скрыня, у якой «выступаюць» лялькі) зроблена па прататыпе першай магілёўскай батлейкі, арыгінал якой цяпер захоўваецца ў Санкт-Пецярбургскім музеі этнаграфіі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Родныя тапонімы

СТАЙКІ — ЖЫТЛО ПАСТУХОЎ?..

На вашы пытанні адказвае старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ

Паважаная рэдакцыя!

Прашу вас расказаць гісторыю паходжання назвы вёскі Стайкі, якая знаходзіцца ў Баранавіцкім раёне Брэсцкай вобласці. Акрамя таго, яна яшчэ носіць назвы трох маленькіх вёсак: Ламашы, Некрашы і Зароўе. Чаму так адбылося, не ведаю, буду вельмі ўдзячна, калі патлумачыце мне.

Ёсць у нашай вёсцы маёнтак (а дакладней, яго рэшткі), у якім з 1947 года размяшчалася наша школа. Апошні пан, які валодаў ім, меў прозвішча Лашкевіч. Кажуць, што ранейшымі яго гаспадарамі былі Ганібалы. Але ад іх маёнтак перайшоў у іншыя рукі: ці то ў карты прайгралі, ці то па якой іншай прычыне.

Кожны нумар вашай газеты чытаю з вялікай цікавасцю. Бо, чытаючы яе, я размаўляю па-беларуску, узгадваю родную мову і вельмі ганаруся ёй.

Марыя Траяновіч, *г. Мінск.*

Паважаная Марыя! На жаль, навуковая анамастычная літаратура, а таксама энцыклапедычныя даведнікі змяшчаюць даволі скупыя звесткі як пра гісторыю, так і пра паходжанне назвы вёскі Стайкі Баранавіцкага раёна. Звычайна апісанне гісторыі вёскі абмяжоўваецца перыядам з пачатку XX стагоддзя да нашых дзён. Затое надзвычай цікавую інфармацыю пра гэта паселішча месцяць разнастайныя краязнаўчыя крыніцы. Менавіта дзякуючы ім можна даведацца, што гэты населены пункт узгадваецца ўжо ў XIV стагоддзі. На той час вёска мела іншае найменне — Зарас.

Напачатку паселішчам валодаў прадстаўнік татарскага княжацкага роду Гусэйн Малікбаш. Пазней, у 1563 годзе, ён прадаў маёнтак Стайкі з навакольнымі землямі Богушу Аўсянніку. З 1571 года Стайкі сталі ўласнасцю дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, мецэната-асветніка, канцлера ВКЛ Яўстафія Валовіча. Па сведчанні краязнаўцаў, у 1787 годзе маёнтак для асабістага пражывання набыў дваранін Мсціслаўскага ваяводства Тамаш Здань Пушкін. Пры гэтым сцвярджаецца, што род Пушкіных вядомы на тэрыторыі Беларусі з 1514 года. Больш за тое, ёсць меркаванне, што і знакаміты рускі паэт Аляксандр Сяргеевіч Пушкін адносіцца да гэтай жа галіны роду. Так гэта ці не пакажуць новыя гістарычныя даследаванні, якія, упэўнены, адкрыюць цікавыя, невядомыя нам факты.

Краязнаўцамі адзначаецца таксама, што амаль на працягу ста гадоў Стайкі пераходзілі ў спадчыну да розных прадстаўнікоў роду Пушкіных. Апошнім уладаром маёнтка з іх роду быў Тамаш Калікст Рафалавіч Пушкін.

Пасля 1876 года сядзіба перайшла да прадстаўнікоў яшчэ аднаго старажытнага беларускага роду — Лашкевічаў. Якім чынам і чаму, невядома, а таму і з'яўляюцца розныя інтрыгуючыя версіі накшталт таго, што ён быў прайграны ў карты. У «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін», выдадзеным у Варшаве ў 1880–1902 гадах, засведчана, што да 1868 года ў Стайках была каталіцкая капліца. Новыя ўласнікі маёнтка Лашкевічы ўпарадкавалі парк, закладзены яшчэ пры Пушкіных, а таксама заклалі новы. Акрамя таго, гаспадарлівыя ўладары пабудавалі тут палац, сыраварню, лядоўню, цагельны завод. Апошнімі ў дарэвалюцыйны час уладальнікамі Стаек былі Іосіф Лашкевіч, з 1911 года — Адольф Іосіфавіч Лашкевіч, а з 1914 года — Наталля Грыцыянаўна Лашкевіч. У гаспадароў маёнтка, верагодна, былі вялікія планы па яго развіцці. Пра гэта, напрыклад, сведчыць той факт, што Іосіф Лашкевіч у 1900 годзе звярнуўся ў мінскае губернскае праўленне з просьбай дазволіць яму будаўніцтва на сваіх землях вінакурні (выказваецца гіпотэза, што ў сувязі з гэтым у арнаменце над уваходам у палац адлюстраваны кілішак) і атрымаў станоўчы адказ. Аднак вядомыя падзеі пачатку XX стагоддзя не дазволілі рэалізавацца задуманым планам. На вялікі жаль, палацава-паркавы комплекс, які па праве можна лічыць гісторыка-культурным і архітэктурным помнікам XIX — XX стст., на сённяшні дзень, мяркуючы па фотаздымках, знаходзіцца ў занядбаным стане і ў хуткім часе можа ўвогуле знікнуць, а мы назаўсёды страцім унікальны аб'ект гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Вёсак з назвай *Стайкі* даволі многа на тэрыторыі нашай краіны. Аднайменныя паселішчы сустракаюцца ў Аршанскім, Браслаўскім, Верхнядзвінскім, Мёрскім, Ушацкім, Чашніцкім раёнах Віцебскай вобласці, у Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці, а таксама ў Барысаўскім, Валожынскім, Вілейскім, Лагойскім, Мінскім раёнах Мінскай вобласці. Яшчэ больш населеных пунктаў з такой назвай было ў мінулым. Пра гэта сведчаць звесткі надзвычай каштоўнай крыніцы па гісторыі мясцовасцей былой Рэчы Паспалітай — «Геаграфічнага слоўніка Каралеўства Польскага і іншых славянскіх краін». Нярэдка сустракаюцца такія ж назвы на землях Украіны і Расійскай Федэрацыі. Гэта сведчыць пра тое, што слова *стайкі* з'яўляецца агульнаўсходнеславянскім. Яно з'яўляецца вытворным ад слова *стаі,* якое на розных усходнеславянскіх тэрыторыях мела рознае значэнне. Так, у мясцовых гаворках украінцаў *стая, стайка* — гэта жытло пастухоў, разнавіднасць шалаша ў гуцульскіх пастухоў. У дыялектах рускай мовы *стаі* — гэта хлявы для жывёлы, канюшні. У заходніх рэгіёнах Беларусі (на Гродзеншчыне) слова *стая* захавалася як земляробчы тэрмін са значэннем «гоня, паласа зямлі ў сто метраў». У старабеларускай мове ўжывалася слова *стай* для абазначэння даўжыні, роўнай прыкладна 80 метрам.

Да Стаек былі далучаны тры невялікія вёсачкі: *Ламашы, Некрашы і Зароўе.* Назвы Ламашы і Некрашы адносяцца да ліку родавых найменняў і ўказваюць на групу сваякоў па імені-мянушцы або прозвішчы *Ламаш* і *Някраш.* У беларускай іменаслоўнай сістэме сустракаюцца прозвішчы *Ламаш, Ломаш, Ломашаў, Ламашук.* Вядомы даследчык у галіне беларускай антрапаніміі акадэмік Мікола Васільевіч Бірыла звязвае паходжанне гэтых прозвішчаў з дыялектным словам *ламаш* («старая паламаная рэч»). Слова *някраш* у старажытнасці ўжывалася ў адносінах да непрыгожага чалавека. Існуе і іншая версія ўзнікнення гэтага прозвішча. Многія старажытныя славянскія імёны, якія потым перайшлі ў прозвішчы, выконвалі не толькі ідэнтыфікуючую, але і ахоўную функцыю. У тыя часы нашы продкі вельмі часта давалі сваім дзецям немілагучныя імёны або імёны з адмоўным значэннем, каб абараніць іх ад усялякіх злых сіл.

Назва *Зароўе* ўказвае на месца размяшчэння паселішча — за ровам.

P.S. *Шаноўныя чытачы! Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага 10а, газета «Звязда». Або па электроннай пошце: igumenski@mail.ru з пазнакай «Родныя тапонімы».*

РАМАНТЫКІ Ў «КРАІНЕ ПАЛЕССЕ»

Тры падарожжы Уладзіміра Караткевіча і Валянціна Ждановіча

Зайшла ў іх кватэру і быццам трапіла ў іншы свет. Пару крокаў і пару імгненняў — і на стале перада мною разліваецца цэлае мора фотаздымкаў. Вялікія і малыя чорна-белыя адбіткі, некаторыя з характэрным цёплым адценнем. А вось цэлы стос фотакартачак беларускіх пісьменнікаў і паэтаў у іх маладыя гады: Аркадзь Куляшоў, Кандрат Крапіва, Пімен Панчанка, Міхась Лынькоў і многія іншыя. Такія прыгожы, такія шчаслівыя. Пэўна, шчаслівым быў і той, хто здымаў нашых класікаў у час іх жыццёвага і творчага росквіту. Асаблівае месца тут займаюць партрэты Уладзіміра Караткевіча, бо іх надзвычай шмат… Вы думаеце, я апынулася ў пэўным музеі фатаграфіі? Насамрэч не. Я завітала ў госці да сваякоў фатографа Валянціна Ждановіча. Яго дачка Валерыя праводзіць для мяне экскурс у творчае мінулае бацькі. Яе сястра Рэгіна частуе шакаладам і зялёнай гарбатай, налітай у згрэбны кубачак.

Асоба і творчасць фатографа Валянціна Ждановіча надзвычай рознабаковая. Шмат што пра яе можна расказаць (і, вядома, паказаць) — і мы паспрабуем зрабіць гэта для чытачоў «Звязды» ў найбліжэйшых нумарах. А сёння проста немагчыма прайсці міма і не спыніцца на яго сумесных вандроўках з Уладзімірам Караткевічам. А іх, між іншым, па адным і тым жа маршруце, з разбежкай у 11 і 4 гады, было тры.

Ждановіч у тыя часы (зрэшты, як і ўсё сваё жыццё) працаваў фотакарэспандэнтам часопіса «Маладосць». У рэдакцыі тады былі вельмі добрыя часы. Там маглі сабе дазволіць фатографа разам з пісьменнікам выправіць у працяглае падарожжа па Палессі, каб адкрыць і адлюстраваць гэты загадкавы край.



Верагодна, гэта тая цыганская ўдава, у якую быў закаханы чарнявы фатограф.

Першая вандроўка адбылася ў 1969 годзе. Па яе выніках Караткевіч напісаў нарыс «Званы ў прадоннях азёр». Класік так апісаў сябе і свайго напарніка: *«І вось яны, журналіст Валянцін і літаратар Уладзімір, ваш пакорлівы слуга, у належны дзень узброіліся фотаапаратамі, рукзакамі, вудамі і мужнасцю і годна ўзышлі на борт паветранага лайнера Мінск — Гомель. Выгляд у гэтых двох быў дужа неавантажны: патрапаныя курткі, нагавіцы, якія прымушалі жадаць лепшага, а на адным яшчэ і кірзавыя боты. Толькі першакласная тэхніка журналіста давала некаторае паняцце, што гэта культурныя людзі, а не басякі»*. Цікавы і яшчэ адзін момант, дзе Караткевіч апісвае Ждановіча: *«Валянцін. Журналіст. Фоталетапісец вылазкі. Чалавек з тых, што ахвотна здымаюць, звісаючы з вежы або шасі верталёта»*.

Вандроўнікі высадзіліся ў «старажытным горадзе на Сажы» (Гомелі). Там селі на цеплаход «Маякоўскі» — у той час суднаходства было досыць інтэнсіўным. Цікава, як Караткевіч расказвае пра яшчэ аднаго ўдзельніка іх «каманды»: *«Параход. Маленькая акуратная шкарлупінка. Жывая. З рухавіком, вінтамі, падвясным кінаэкранам. З голасам. Бадзёрым раніцою і сонным над соннай вячэрняй вадой»*.

Гэты сплаў на цеплаходзе аказаўся надзвычай шчаслівым для вандроўнікаў, напоўненым яскравымі сустрэчамі і здарэннямі. Яны часам рабілі прыпынкі ў палескіх вёсках, па-сяброўску сядзелі з мясцовымі жыхарамі. Разам з фальклярыстам Арсенем Лісам, які далучыўся да іх, запісвалі мясцовую творчасць. Гэтыя вёскі сапраўды жылі, красавалі ўсімі сваімі фарбамі. Шмат маладых людзей, прыгожых дзяўчат сустракала іх тут. Палессе адкрывалася ўсёй сваёй прыгажосцю, дазваляла творцам занатаваць яе.

Нечакана для саміх сябе ў Давыд-Гарадку яны трапілі на ўгодкі цыганскага суддзі. Вялікая колькасць загарэлых, смелых мужчын. Іх жанчыны вабілі таямнічай прыгажосцю. Пра тое, што нейкая цыганка такі пакінула след у душы ці Караткевіча, ці Ждановіча, можна сцвярджаць з упэўненасцю. Бо акурат такая сустрэча апісана ў апавяданні «Краіна цыганія». Там аўтар распавядае пра чарнявага фатографа (так выглядаў Ждановіч), якога цыганы прынялі за свайго, апісвае той вір пачуццяў, што ўзняўся ў яго душы, калі ён пазнаёміўся з маладой цыганскай удавой…

Мэтай гэтай вандроўкі было перасекчы ўсё Палессе наскрозь. Са сваімі паплечнікамі пісьменнік разышоўся ў Пінску (ім трэба было вярнуцца ў сталіцу). Аднак сам працягнуў вандроўку: *«Я ехаў аўтобусамі і спадарожнымі машынамі, ішоў пешшу, перапраўляўся цераз рэчкі і каналы, закідваў вуды ў спакойныя завадзі і абрываў кручкамі гарлачыкі, урэчнік і расіцу. Сузор'е Рэшата ўначы мігцела нада мной і рыбы, тлустыя ад ашыткаў, непаразумела глядзелі з-пад вады на маё вогнішча»*. Праходзячы такім шляхам, рамантычна настроены Караткевіч дабраўся аж да белай Камянецкай вежы, да самага Брэста.

Другое падарожжа, па заданні рэдакцыі, **было прымеркавана да 1000-годдзя Турава і адбылося ў 1980 годзе.** На гэты раз Караткевіч быў ужо не такім жыццярадасным. У сваім эсэ «Сцюдзёная вясна, або 1000 год і 7 дзён» ён разважае пра страчаныя каштоўнасці старажытнага горада. На месцы аўтэнтычных фундаментаў узводзяцца новыя будынкі, што не можа не непакоіць пісьменніка: *«І археолагі, якія часам праводзяць на гарадзішчы раскопы, знаходзячы то муры, то пілястры нейкага будынка, то шыферны княскі (ці біскупскі) саркафаг, ці рэшткі шасцістоўпнага трохаспіднага храма, не могуць паспець за так званай гаспадарчай дзейнасцю чалавека (мала для яе месца па суседству!) або проста за адміністрацыйным свербам неразумных людзей, якія пагарджаюць нашымі законамі, бо нікога яшчэ не каралі за непавагу да роднай гісторыі. І археалогія, толькі раскрыўшы рот, вымушана часам навекі замаўчаць «дбаннем» гэтых людзей. А за яе, у большасці выпадкаў, не скажа ніхто»*.

Як чалавек, які так любіў гісторыю, Караткевіч кажа пра фактычны вандалізм у старажытным горадзе. Яго інтэлігентнасці і стрыманасці варта павучыцца.

Непакоіла нашага класіка і меліярацыя, якая поўным ходам ішла на Палессі. Караткевіч думае пра тое, які лёс напаткае яго любімую дуброву, лес з дрэвамі-волатамі: клёнамі, ясенямі, грабамі, ліпамі, *«гіганцкімі вольхамі над лясnымі ручаінамі»*. Ён піша: *«Я баюся гэтага, бо люблю гэтую зямлю. Мы можам пацярпець без гэтых гектараў… І мы заворваем неацэнныя прыпяцкія паплавы, заворваем пашу»*.

Агульны настрой пісьменніка сімвалізуе тая самая «сцюдзёная вясна». Але ж яна не толькі назаляе Караткевічу сваім холадам, але і натхняе яго ўпартым чаканнем цяпла, лепшай пары.

На гэты раз па рацэ яны перапраўляюцца на пароме. Вялікі, магутны, ён сімвалізуе жыццёвую сілу ракі. Аўтар піша: *«Едуць дзеці і дарослыя, едуць вазы з сенам, едуць спявучыя вяселлі і слёзныя хаўтуры (і вецер развейвае чорныя стужкі на крыжах)… І таму круглыя суткі і ўвесь час вольнай вады крэйсіруе паромам, жартуе, рагоча, плача, заляцаецца і сварыцца на гэтым пароме жывое Палессе»*.

Трэцяе падарожжа Караткевіч і Ждановіч здзяйснілі ў 1984 годзе. Тады яны дасталі марскі плыт — такі, што звычайна апошнім спускаюць на ваду, перад тым як тоне карабель. На ім яны хацелі зноў ад Пінска праплыць па ўсёй Прыпяці. Але рака моцна супраціўлялася. Плошча гэтага надзіманага плыта была досыць вялікай, таму вецер пастаянна імкнуўся яго знесці, насуперак плыні. Яны думалі, што будуць проста сплываць уніз, як на Маякоўскім, але так не атрымалася. Давялося ледзь не на сабе цягнуць плыт, бы бурлакам.



Уладзімір Караткевіч падчас вандроўкі, прысвечанай 1000-годдзю Турава.

У 1984 годзе моладзь ужо павыязджала з палескіх вёсак. Быў заняпад, бо шмат сродкаў пайшло на будаўніцтва такіх прамысловых аб'ектаў, як Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод. Гэта ўсё адбілася на стане прыроды, на забруджанасці навакольнага асяроддзя.

Караткевіч тады быў у вельмі дрэнным маральным і фізічным стане. Ён толькі пахаваў жонку, якая хварэла на рак. Яе смерць ён цяжка перажываў, ляжаў у шпіталі.

Пісьменніку своечасова не паставілі правільны дыягназ. Яму ўвесь час давалі таблеткі, праз што адкрылася язва. А падчас вандроўкі, у Тураве ў раённай бальніцы, нарэшце высветлілі, чым насамрэч ён хворы. Яго тэрмінова завезлі ў лечкамісію, але так і не аказалі кваліфікаванай дапамогі. Караткевіч вярнуўся ў Мінск. Неўзабаве ён памёр.

Апошняе прыжыццёвае фота класіка, з трэцяй вандроўкі, зрабіў Валянцін Ждановіч.

Гэта падарожжа пісьменніка занатаванае ў яго дзённіку, бо ён пастаянна вёў нататкі. На маё здзіўленне, у зборы твораў Караткевіча яго дзённікаў не аказалася. Яны былі надрукаваны толькі ў часопісе «Маладосць» неўзабаве пасля яго смерці ў 1984 годзе. У новым 25-томным зборы твораў Караткевіча, некалькі кніг якога ўжо з'явіліся ў продажы, дзённікі таксама запланаваныя да выхаду.

…Ля нашых ног, пад сталом, на якім ляжаць стосы фотаздымкаў, пачынае перавальвацца такса — яшчэ адзін жыхар гэтай кватэры. На калені да Валерыі Ждановіч заскоквае яе пляменнік Максім, сын Рэгіны, пачынае лашчыцца. Тым часам яна адзначае: «Караткевіч быў рамантыкам і пражыў рамантычнае жыццё. Можна было жыць у суседняй з ім кватэры і не бачыць нічога такога, што бачыў ён…»

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фотаздымкі з асабістага архіва сям'і Ждановічаў.



Апошняе прыжыццёвае фота пісьменніка.

■ Споведзь

КАБ ДОЎЖЫЛАСЯ ЖЫЦЦЁ

Новы мастацка-дакументальны твор Алеся Савіцкага «Пісьмо ў Рай» — выдатны раман-споведзь пісьменніка, узнёслае маленне, адрасаванае памерламу бацьку, які пражыў пякельна-пакутлівае жыццё і зазнаў цяжкую смерць. Аповед вядзецца ад імя лірычнага героя — Андрэя Смоліча. Твор прысвечаны памяці Ануфрыя Якаўлевіча Савіцкага і, відавочна, мае аўтабіяграфічную аснову.



На старонках рамана-споведзі аўтар асэнсоўвае лёс беларускай нацыі падчас вайны і ў пасляваенны час. Унутраным зрокам пісьменнік уважліва паказвае вельмі супярэчлівую і драматычную эпоху, аглядае ўласнае пражытае жыццё і лёсы блізкіх яму людзей, з вышыні часу аналізуе розныя эпізоды і сітуацыі, у якія трапляў паводле асабістага жадання ці, часцей, па волі выпадку. Аповед у рамане часта перарываецца пранікнёнымі зваротамі галоўнага героя да памерлага бацькі, разважаннямі пра яго цяжкі лёс.

Вельмі светлыя і шчымліва-цёплыя ў рамане ўспаміны пра дзяцінства — эпізод пра лыжны пераход з Полацка ў Кутняны, сцэна шчодрай пачосткі ў цёткі Марфы, рыбалка на Дзвіне з жывым бацькам, паходы ў грыбы, наведванне Барысавага каменя, які ляжаў у Дзвіне і ў засушлівае лета, калі рака мялела, быў добра бачны. Надзвычай кранальныя ўспаміны аўтара пра маці.

На старонках твора пісьменнік згадвае шматлікія эпізоды з партызанскага жыцця, перадае ўласнае ўзрушэнне падчас наведвання месцаў колішніх бітваў. У яго памяці ўспліваюць найбольш яркія моманты змагання з фашысцкімі захопнікамі — выплаўка толу са снарадаў у кузні вёскі Пятроўцы, цяжкія баі партызанскай брыгады ўлетку сорак трэцяга года, жахлівая смерць баявых таварышаў, раненне і лячэнне ў палявым шпіталі.

Вельмі павучальныя ўражанні Алеся Савіцкага ад наведвання Германіі і знаёмства з колішнім салдатам вермахта, які ў гады вайны трапіў у савецкі палон, але здолеў выжыць і вярнуцца дамоў. Яго жыццё кантраставала з жыццём тых, хто перамог фашызм, бо яго ніхто не дакараў і нічым не папракаў.

Як пісьменнік-рэаліст Савіцкі паказаў драматызм жыцця — акупацыю немцамі Беларусі, бежанства людзей на ўсход, вяртанне на захопленую ворагам тэрыторыю, перыпетыі ваеннага часу. Пісьменнік раскрыў трагедыю людзей, лёсы якіх былі зламаны вайной і сталінскімі рэпрэсіямі. Так, бацька галоўнага героя Смоліча быў асуджаны на пяць гадоў і адпраўлены ў лагер толькі за тое, што трапіў у палон і не змог застрэліцца, бо ў нагане скончыліся патроны.

Асабліва драматычным быў лёс дзяўчат і маладых жанчын, якія аказаліся на акупаванай тэрыторыі і прайшлі праз неверагодныя пакуты і здзекі. Маналог маладой жанчыны Жанны — сведчанне жахаў, што прынеслі вайна і фашызм на беларускую зямлю. Не менш трагічным аказалася жыццё дзяўчыны падчас вяртання бальшавікоў і чэкістаў, якія прагнулі кантраляваць усё грамадства. Душэўныя пакуты і ўнутраны боль жанчыны аказаліся мацнейшымі за прагу да жыцця — і яна, урэшце, пайшла на самагубства.

Мудрасць, веды і досвед продкаў, на думку Алеся Савіцкага, — асноўны стрыжань паўнавартаснага працягу жыцця.

Раман-споведзь «Пісьмо ў Рай» адрозніваецца асаблівым псіхалагізмам: ён незвычайна эмацыйны, напоўнены людскім болем, роспаччу і невымернай тугой. Сцэна атрымання ліста ад жывога бацькі, якога лічылі без вестак прапаўшым у сорак першым годзе, уражвае глыбінёй перажыванняў герояў. Алесь Савіцкі бліскуча перадаў пакуты сям'і салдата-франтавіка, які быў несправядліва сасланы ў лагер на востраў Пуцяцін, што ў Японскім моры. Пісьменнік распавядае пра неверагодныя перажыванні маці, якая страціла мужа і двух сыноў. Пасля гэтай трагедыі жыццё для яе згубіла ўсялякі сэнс.

Мастацкімі сродкамі майстар слова паказаў неверагодны боль, бясконцую крыўду і адчай юнака, які атрымаў чорную вестку пра смерць бацькі ў лагеры. Разгублены Андрэй Смоліч адчувае безвыходнасць і поўную бездапаможнасць, не ведае, што рабіць, каму скардзіцца, каго прасіць і каго вінаваціць. Да глыбіні душы ён узрушаны і пасля наведвання лагера ваеннапалонных чырвонаармейцаў у Баравусе. Убачанае і пачутае там урэзалася ў яго памяць на ўсё жыццё. Небывалы душэўны боль зазнаў герой рамана, калі даведаўся праўду пра дзяўчыну, якую пакахаў усім сэрцам.

На старонках рамана-споведзі Алесь Савіцкі надзвычай дэталёва асвятліў працэс развітання з ілюзіямі тых людзей, якія шчыра верылі ў непагрэшнасць Іосіфа Сталіна. Так, галоўны герой Андрэй Смоліч піша яму ліст, у якім распавядае пра невінаватасць бацькі, пра сваю веру ў справядлівасць і бясконцую адданасць «дарагому правадыру». Але ў адказ ён атрымлівае кароценькае паведамленне следчага з Упраўлення па справах рэабілітацыі, дзе катэгарычна заяўлялася пра адсутнасць належных падстаў для перагляду справы. На новы ліст да Сталіна герой атрымаў чарговую адпіску, напоўненую «бяздумнай паспешлівасцю, пагардлівасцю і абыякавасцю».

Алесь Савіцкі справядліва і гістарычна дакладна піша пра тое, што ў перыяд кіравання Сталіна, Хрушчова і Брэжнева адукаваныя людзі выдатна бачылі рэаліі і ўсведамлялі сутнасць афіцыйнай прапаганды, якая прыхарошвала рэчаіснасць. Яны прыходзілі да смелай высновы пра тое, што палітыкі хаваюць праўду ад народа, а ў сваіх заявах і дзеяннях кіруюцца пераважна ўласнымі інтарэсамі.

Пісьменнік-інтэлектуал разважае аб складанасцях чалавечага лёсу і, урэшце, прыходзіць да высновы пра неабходнасць дараванння, прымірэння, нават паміж самымі лютымі і заклятымі ворагамі. Ён выступае супраць фальшу і падману ва ўсіх сферах жыцця — у палітыцы, у адносінах паміж народамі, паміж сябрамі і каханымі. Хлусня, паводле яго слоў, заўжды вядзе да варожасці, непазбежных разбурэнняў і страт. У асабістым і сямейным жыцці падман і хлусня тым больш недапушчальныя, бо яны разбураюць давер і аснову жыцця.

Мудрасць, веды і досвед продкаў, на думку Алеся Савіцкага, — асноўны стрыжань паўнавартаснага працягу жыцця. Пісьменнік слушна гаворыць пра неабходнасць шанавання народных святыняў, захавання запаветаў бацькоў і дзядоў, павагі да зробленага і створанага імі: «Цяпер ведаю дакладна: калі чалавек не моліцца памяці бацькоў і дзядоў, калі не ахоўвае святыні свайго народа, дык на ягонай дарозе ружы не зацвітуць аніколі». Алесь Савіцкі ўпэўнены, што чалавек прыходзіць на зямлю з місіяй памножыць прыгажосць гэтага свету, «каб нязводная на зямлі была толькі радасць».

Заключная сцэна рамана — назіранне за хлопчыкам, маленькім рыбачком, які славіў на вуду вялізнага язя на Палаце і неверагодна шчаслівы ад улову, — сведчанне непахіснай веры пісьменніка ў добры набытак нашчадкаў.

Іван САВЕРЧАНКА,
доктар філалагічных навук,
прафесар.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ЧЕТВЕРТОГО ВЫПУСКА

Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЗахадІнвестСістэмз» (ТАА «ЗахадІнвестСістэмз»)

Общества с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз» (ООО «ЗападИнвестСистемз»)

г. Минск 2014 г.

1. Полное и сокращенное наименование эмитента.

На белорусском языке:

полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЗахадІнвестСістэмз»;

сокращенное – ТАА «ЗахадІнвестСістэмз».

На русском языке:

полное – Общество с ограниченной ответственностью «ЗападИнвестСистемз»;

сокращенное – ООО «ЗападИнвестСистемз» (далее – эмитент).

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).

Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, каб. 12;

Телефон/факс: 8 (017) 346 41 37; (e-mail): info@tapas.by.

3. Основные виды деятельности эмитента.

Подготовка к продаже недвижимого имущества (код 70110 согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006).

4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка.

Расчетный счет в белорусских рублях № 3012154144014 в ОАО «БПС-Сбербанк» (адрес банка: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь, БИК 153001369, УНП 100219673).

5. Наименование периодических печатных изданий, определенных эмитентом для раскрытия информации и сроки таких публикаций.

Бухгалтерская отчетность эмитента будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года.

Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента будет публиковаться в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения.

Информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) будет публиковаться в печатных средствах массовой информации, учрежденных Высшим Хозяйственным Судом Республики Беларусь, в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.

Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 7 (Семи) дней с даты государственной регистрации соответствующих изменений в регистрирующем органе.

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента.

Наименование депозитария: Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк» (далее – депозитарий).

Место нахождения депозитария: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь.

Депозитарий зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г. (Регистрационный №25).

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам №02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30 января 2022 года.

7. Размер уставного фонда эмитента.

Уставный фонд эмитента 42 240 000 (Сорок два миллиона двести сорок тысяч) белорусских рублей.

8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.

Решение о четвертом выпуске жилищных облигаций (далее – облигации) принято Общим собранием участников эмитента 09 декабря 2014 г. (протокол от 09.12.2014 №31).

9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.

Форма выпуска и вид облигаций	Бездокументарные, именные, конвертируемые
Объем эмиссии облигаций	12 200 000 000 (Двенадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей
Количество облигаций	2 000 (Две тысячи) штук
Серия облигаций	ЗИС-4
Номера облигаций	000001-002000

10. Номинальная стоимость облигации.

Номинальная стоимость одной облигации составляет 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (Одному) квадратному метру общей площади жилого помещения в жилом доме № 4 в составе объекта «Жилые дома, не относящиеся к домам повышенной комфортности, по индивидуальным проектам в жилом районе «Дружба» по генплану на земельном участке, расположенном в Московском административном районе г. Минска (далее – Жилой дом).

11. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.

Облигации выпускаются с целью привлечения денежных средств юридических и (или) физических лиц на осуществление строительства Жилого дома, на финансирование иных мероприятий, связанных со строительством указанного дома, а также на пополнение оборотных средств эмитента. Денежные средства, полученные от размещения облигаций, используются в соответствии с целями их выпуска.

12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.

В качестве обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям выступает поручительство Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» на сумму 12 200 000 000 (Двенадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 09.12.2014 №1/12

13. Период размещения облигаций.

Дата начала размещения облигаций – 22.12.2014.

Дата окончания размещения облигаций – 31.12.2017.

14. Место, время и порядок размещения облигаций.

Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, третий этаж, каб. 12.

Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.

Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.

Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

15. Срок обращения облигаций.

Срок обращения облигаций устанавливается с 22.12.2014 по 31.01.2018 (1136 календарных дней).

16. Дата начала погашения облигаций.

Датой начала погашения облигаций является 31.01.2018.

17. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

18. Дата и номер государственной регистрации облигаций.

Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31 декабря 2014 г.

Регистрационный номер: 5-200-02-2492.

19. Сведения о месте, времени и способе ознакомления с проспектом эмиссии облигаций.

С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться по адресу: Республика Беларусь, 220070, г.Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, каб.12 ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 или по телефону 8 (017) 346 41 37.

Генеральный директор
Управляющей компании эмитента А.Г. Савицкий

Ответственный
бухгалтер эмитента Н.Г. Гармашук

ОАО «Промэлектромонтаж»

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 16 марта 2015 г. очередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Аранская, 13.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах работы Общества в 2014 году и основных направлениях развития на 2015 год.
2. Отчет Совета директоров и ревизионной комиссии о работе в 2014 году.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2014 год. О дивидендах за 2014 год.
4. О направлениях использования прибыли Общества в 2015 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
6. Выборы членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
7. Об уменьшении уставного фонда Общества путем аннулирования приобретенных Обществом акций собственного выпуска и сокращения их общего количества.
8. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Промэлектромонтаж» и их утверждение.

Местонахождение ОАО «Промэлектромонтаж»: **г. Минск, ул. Аранская, 13.**
Место проведения собрания: **г. Минск, ул. Аранская, 13 (второй этаж).**
Начало работы собрания **в 12.00.**
Регистрация участников собрания **с 11.00 до 11.50** в день проведения собрания.
При себе иметь документ, удостоверяющий личность.
Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 2 марта 2015 г.**

УНП 100088916 ***Совет директоров ОАО «Промэлектромонтаж».***

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Стать свидетелем истории – бесценно»

Организатор Рекламной игры: Общество с ограниченной ответственностью «Пиар квадрат», УНП 191682518.
Место нахождения организатора: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Амураторская, д. 4Б, пом. 20.
Наименование Рекламной игры: «Стать свидетелем истории – бесценно»
Свидетельство № 2436 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 01 октября 2014 года Министерством торговли Республики Беларусь.
Территория проведения рекламной игры: Республика Беларусь.
Срок начала рекламной игры: 15 октября 2014 г.
Срок окончания рекламной игры: 3 февраля 2015 г.
В рекламной игре приняло участие **360196** участников.
Призовой фонд был разыгран полностью.

Сведения о победителях рекламной игры и их выигрышах
1. Победители в розыгрыше Главного приза

№	Фамилия и инициалы победителя	Выигрыш
1	Авсенович В.В.	Поездка в Германию, г. Берлин на финал Лиги Чемпионов UEFA. Поездка на двоих человек с 5 по 7 июня 2015 года стоимостью 19 880 000 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 2 607 955 белорусских рублей
2	Кобец А.Е.	Поездка в Германию, г. Берлин на финал Лиги Чемпионов UEFA. Поездка на двоих человек с 5 по 7 июня 2015 года стоимостью 19 880 000 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 2 607 955 белорусских рублей

2. Победители в розыгрыше призов Первой категории (Спортивная сумка Relax стоимостью 146 160 белорусских рублей) – 2000 победителей.
3. Информация о победителях размещена на сайтах: **www.mastercard.by, www.zviazda.by**
Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: + 375 17 306 25 73.

5 марта 2015 г. в 15.30 по адресу: ул. Промышленная, 11 СОСТОИТСЯ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ЗАО «СМУ-77».
УНН 100064641

БЕЛАРУСБАНК

ПУБЛИЧНАЯ ОФЕРТА (ПРЕДЛОЖЕНИЕ)

о начислении поощрительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях «Интернет-депозит», «Интернет-депозит-Презент», «Интернет-депозит-Тренд»

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает начисление поощрительного процентного дохода по следующим срочным банковским вкладам в белорусских рублях в период:
с 30.01.2015 по 26.02.2015 (включительно)
- **«Интернет-депозит»** – в размере 9% годовых;
- **«Интернет-депозит-Презент»** – в размере 10,5% годовых;
- **«Интернет-депозит-Тренд»** (вне зависимости от срока и ежедневного остатка вклада) – в размере 8% годовых.

Начисление и выплата поощрительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 30.01.2015 или дня открытия вклада (депозита) по 26.02.2015 (включительно) в порядке, установленном соответствующим договором банковского вклада (депозита) для начисления и выплаты основных процентов.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного процентного дохода

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.
Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 05 марта 2015 года проводит 4-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности.

Номера лотов	Наименование техники	Местонахождение объекта	Начальная цена продажи (бел. руб.)	Сумма задатка (бел. руб.)
49	Автоцистерна АЦ-5,5-4320М с/о 5901 на УрАЛ–4320М ш. 050234 дв. 845397 1986 г. 4 кат. 62292,5 км	г. Барановичи, в/ч 55435	50 000 000	5 000 000

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» № 15 от 27 января 2015 года.
Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.

УНП 101099370

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ ШЕСТОГО ВЫПУСКА

Общества с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ» (ООО «ДЕКО-ПЛАСТ»)

г. Минск 2014 г.

1. Полное и сокращенное наименование эмитента.
На белорусском языке:
полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ДЭКА-ПЛАСТ»;
сокращенное – ТАА «ДЭКА-ПЛАСТ».
На русском языке:
полное – Общество с ограниченной ответственностью «ДЕКО-ПЛАСТ»;
сокращенное – ООО «ДЕКО-ПЛАСТ» (далее – эмитент).

2. Место нахождения эмитента, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, офис 5;
Телефон/факс: 8 (017) 346 41 37; (e-mail): info@tapas.by.

3. Основные виды деятельности эмитента.
Подготовка к продаже недвижимого имущества (код 70110 согласно Общегосударственному классификатору Республики Беларусь «Виды экономической деятельности» ОКРБ 005-2006).

4. Номер расчетного счета эмитента, на который будут зачисляться средства, поступающие при проведении открытой продажи облигаций, наименование обслуживающего банка.
Расчетный счет в белорусских рублях № 3012103311016 в ОАО «БПС-Сбербанк» (адрес банка: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь, БИК 153001369, УНП 100219673).

5. Наименование периодических печатных изданий, определенных эмитентом для раскрытия информации и сроки таких публикаций.
Бухгалтерская отчетность эмитента будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее трех месяцев со дня окончания отчетного финансового года.
Информация о принятом решении о реорганизации или ликвидации эмитента будет публиковаться в приложении к журналу «Юстиция Беларуси» в срок не позднее двух месяцев с даты принятия соответствующего решения.
Информация о возбуждении в отношении эмитента производства по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) будет публиковаться в печатных средствах массовой информации, учрежденных Высшим Хозяйственным Судом Республики Беларусь, в течение пяти дней с момента получения соответствующего судебного постановления.
Информация о внесенных изменениях в Проспект эмиссии будет публиковаться в газете «Звязда» в срок не позднее 7 (Семи) дней с даты государственной регистрации соответствующих изменений в регистрирующем органе.

6. Наименование депозитария, обслуживающего эмитента.
Наименование депозитария: Открытое акционерное общество «БПС-Сбербанк» (далее – депозитарий);
Место нахождения депозитария: бульвар имени Мулявина, 6, 220005, г. Минск, Республика Беларусь.
Депозитарий зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г. (Регистрационный №25).

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам № 02200/5200-1246-1086, выдано Министерством финансов Республики Беларусь, действительно по 30 января 2022 года.

7. Размер уставного фонда эмитента.
Уставный фонд эмитента 5 560 000 000 (Пять миллиардов пятьсот шестьдесят миллионов) белорусских рублей.

8. Дата принятия решения о выпуске облигаций и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о шестом выпуске жилищных облигаций (далее – облигации) принято Общим собранием участников эмитента 09 декабря 2014 г. (протокол от 09.12.2014 № 34).

9. Форма выпуска облигаций, объем эмиссии, количество облигаций.

Форма выпуска и вид облигаций	Бездокументарные, именные, конвертируемые
Объем эмиссии облигаций	12 200 000 000 (Двенадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей
Количество облигаций	2 000 (Две тысячи) штук
Серия облигаций	ДКП-6
Номера облигаций	000001-002000

10. Номинальная стоимость облигации.
Номинальная стоимость одной облигации составляет 6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей и имеет эквивалент, равный 1 (Одному) квадратному метру общей площади жилого помещения в жилом доме № 2 в составе объекта «Многоэтажные жилые дома со встроенно-пристроенными объектами торговли, административными помещениями, полузаглубленной и наземной автостоянкой в жилом районе Лебяжий в г. Минске» (далее – Жилой дом).

11. Цель выпуска облигаций и направления использования средств, полученных от размещения облигаций.
Облигации выпускаются с целью привлечения денежных средств юридических и (или) физических лиц на осуществление строительства Жилого дома, на финансирование иных мероприятий, связанных со строительством указанного дома, а также на пополнение оборотных средств эмитента. Денежные средства, полученные от размещения облигаций, используются в соответствии с целями их выпуска.

12. Сведения об обеспечении исполнения обязательств по облигациям.
В качестве обеспечения исполнения обязательств эмитента по облигациям выступает поручительство Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС» на сумму 12 200 000 000 (Двенадцать миллиардов двести миллионов) белорусских рублей согласно договору о предоставлении поручительства от 09.12.2014 №2/12
Место нахождения поручителя: 220070, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Радиальная, 54б, 3й этаж, офис 10.

13. Период размещения облигаций.
Дата начала размещения облигаций – 22.12.2014.
Дата окончания размещения облигаций – 20.04.2019.

14. Место, время и порядок размещения облигаций.
Проведение открытой продажи облигаций осуществляется эмитентом самостоятельно ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, 54Б, третий этаж, офис 5.
Открытая продажа облигаций осуществляется физическим и (или) юридическим лицам в соответствии с законодательством Республики Беларусь путем заключения соответствующего договора.
Жилищные облигации имеют право приобретать (как в процессе размещения жилищных облигаций, так и в процессе их обращения) юридические и физические лица, заключившие с эмитентом договор в простой письменной форме, предусматривающий обязательства эмитента по строительству жилых помещений владельцам жилищных облигаций.
Открытая продажа облигаций осуществляется по цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи жилищных облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг.

15. Срок обращения облигаций.
Срок обращения облигаций устанавливается с 22.12.2014 по 20.05.2019 (1610 календарных дней).

16. Дата начала погашения облигаций.
Датой начала погашения облигаций является 20.05.2019.

17. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.
Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

18. Дата и номер государственной регистрации облигаций.
Облигации зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 31 декабря 2014 г.
Регистрационный номер: 5-200-02-2491.

19. Сведения о месте, времени и способе ознакомления с проспектом эмиссии облигаций.
С более подробной информацией (проспектом эмиссии облигаций) можно ознакомиться по адресу: Республика Беларусь, 220070, г. Минск, ул. Радиальная, д. 54Б, третий этаж, офис 5 ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством Республики Беларусь) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 или по телефону 8 (017) 346 41 37.

Генеральный директор Управляющей компании эмитента А.Г. Савицкий

Ответственный бухгалтер эмитента Н.Г. Гармашук

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукционов: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: Открытое акционерное общество «Витебский хладокомбинат», г. Витебск, ул. Полярная, 8, тел./ф.: 8(0212) 23-16-72

Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным № 200/С-46403, общая площадь 645,2 кв.м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43 на земельных участках: кадастровый № 240100000003001750 (Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43), кадастровый № 240100000003007468 (Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43А/11); Капитальное строение с инвентарным № 200/С-51544, общая площадь 66 кв.м, назначение: здание специализированное транспорта, наименование – гараж-склад, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43/1 на земельном участке: кадастровый № 240100000003001750 (Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43); Капитальное строение с инвентарным № 200/С-87067, протяженностью 107,1 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, водопроводная сеть к зданию № 43; Капитальное строение с инвентарным № 200/С-87069, протяженностью 55,7 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – хозбытовая канализационная сеть, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, хозбытовая канализационная сеть от здания № 43; Капитальное строение с инвентарным № 200/С-51546, общая площадь 12 кв.м, назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – водомерный узел, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43А/11 на земельном участке с кадастровым № 240100000003007468 (Витебская обл., г. Витебск, ул. Максима Горького, 43А/11).
Начальная цена: 3 996 000 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка 399 600 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **16.02.2015 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи документов: **с 03.02.2015 с 8.30 по 13.02.2015** до 17.30. Условия аукциона: заключить договор купли-продажи не позднее 20 дней с момента подписания протокола о результатах аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи; оплатить НДС в размере 20% от цены продажи имущества. Извещение опубликовано в газете «Рэспубліка» от 10.12.2014.

Продавец: Открытое акционерное общество «Витебский приборостроительный завод», 210026, г. Витебск, ул. Гагарина, 4, тел. 8 0212 54-89-77.

Лот № 1. Лифт грузовой ПЧ-ЖВ грузоподъемностью 2000 кг, инв. № 01300613. Имущество расположено по адресу: г. Витебск, ул. Гагарина, 4. **Начальная цена: 62 724 500 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 6 272 000 бел. руб.**

Аукцион состоится 06.03.2015 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи документов: **с 03.02.2015 с 8.30 по 05.03.2015** до 17.30. Условие аукциона: оплата НДС в размере 20% от цены продажи имущества. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата предмета аукциона осуществляется в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи.

Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30. до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение). Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов и в порядке, установленном главой 3 Положения. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Задатки перечисляются на р/с 3012078870010, ЦБУ № 2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

■ Пастфактум

А ДЗЕ МНЕ ЎЗЯЦЬ ТАКУЮ «ЛІРУ»?

Прызавыя статуэткі Нацыянальнай музычнай прэміі знайшлі сваіх уладальнікаў

Галоўная музычная прэмія краіны існуе ў Беларусі ўжо не першы год. Але з цягам часу яе ўручэнне стала выклікаць усё менш імпэту і ўсё больш пытанняў з боку як слухачоў, так і саміх артыстаў і прадзюсараў. І калі стала відавочна, што ўзнагародзе патрэбна абнаўленне і «перафарматаванне», у справу ўмяшалася Міністэрства культуры. Нацыянальная музычная прэмія, па-першае, набыла канкрэтную назву «Ліра», па-другое, змяніла суарганізатараў і перабралася з канала СТБ на Агульнанацыянальнае тэлебачанне. Але, мабыць, галоўнае, што змянілася, — крытэрыі вылучэння намінантаў і ўласна спіс прызавых намінацый. Мяркуючы па ўсім, рэбрэндынг даў плён: паводле слоў міністра культуры Барыса Святлова, які адкрываў сёлетнюю (як ніколі лаканічную і часткова беларускамоўную) цырымонію, пасля шэрагу гэтых змяненняў прэмія выклікала вялікую цікавасць у прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі.



Сімвалам нацыянальнай музычнай прэміі «Ліра» стала дзяўчына ў залатым, якая ўвасобіла беларускую эстраду.

Гурт Navi — аўтары і выканаўцы лепшай беларускамоўнай песні 2014 года.

У выбары найбольш яркіх і вартых узнагароды артыстаў айчыннай эстрады на гэты раз удзельнічалі не толькі прафесіяналы ў галіне папулярнай музыкі, але і самі слухачы і гледачы. Менавіта выбар апошніх шмат у чым паўплываў на размеркаванне прызавых статуэтак «Ліра». Сімвалічным увасабленнем вяршыні эстраднага мастацтва, дарэчы, стаў не музычны інструмент ліра, як чакалася з назвы, а постаць зграбнай дзяўчыны.

На галоўную ўзнагароду за найлепшую песню года прэтэндавалі каля паўсотні беларускіх артыстаў, але да фінальнай намінацыі дайшлі толькі трое: Іскуі Абалян, Ганна Шаркунова і Тэо. Апошняму якраз і ўсміхнулася ўдача, а можа, сыграла на руку папулярнасць пасля конкурсу «Еўрабачанне-2014» — і артыст атрымаў ажно дзве статуэткі: «Найлепшая песня года» за «Cheesecake» і «Найлепшы выканаўца года» — за сябе самога.

Найлепшай песняй на беларускай мове стала кампазіцыя маладога гурта Navi «Абдымі мяне». Кранальнае відэа Жанет «You Will Be Here» (знятае паводле песні, з якой спявачка ўдзельнічала ў 2013-м у нацыянальным адборы зноў жа на «Еўрабачанне») стала найлепшым кліпам. Тытул «Адкрыццё года» дастаўся створанаму па гарачых слядах конкурсу «Містэр Беларусь-2014» гурту «Misters». «Ліру» як найлепшы аўтар слоў атрымала паэтка Алена Ермаловіч, «Найлепшым аранжыроўшчыкам» суддзі назвалі Андрэя Саўрыцкага.

Адразу некалькі прызавых статуэтак запісаў у свой актыў прадзюсарскі цэнтр «Спамаш», які адзначае сёлета 10-годдзе: найлепшым аўтарам музыкі стаў мастацкі кіраўнік цэнтра, кампазітар Леанід Шырын, узнагароду «Стыль года» атрымаў саліст цэнтра Аляксей Грос, і, нарэшце, званне «Прадзюсар года» было прысуджана таксама «Спамашу», праўда, неасабова, а наогул.

Двойчы быў адзначаны ўзнагародамі сямейны і творчы дуэт Аляксандра Ціхановіча і Ядзвігі Паплаўскай: прадказальна — «За ўнёсак у развіццё эстраднай папулярнай музыкі» і нечакана для многіх, але тым не менш заслужана — як найлепшыя арганізатары канцэртаў (прадзюсарскі цэнтр «Профіартвідэон» летась зладзіў больш як 200 разнастайных канцэртаў).

Прыз «За папулярызацыю беларускай музыкі за мяжой» атрымаў гурт «IOWA», «Найлепшым музычным тэлепраектам у сферы эстраднай творчасці» быў названы тэлепраект «Легенды. Live» вытворчасці АНТ, а ганаровую ўзнагароду як мецэнат у сферы папулярнай эстраднай творчасці вядучыя цырымоніі ўручылі прадстаўнікам «Беларускалія» — кампанія, у прыватнасці, летась выступіла афіцыйным партнёрам фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Узнагароду за лепшую песню года ўзяў спявак і аранжыроўшчык Тэа.

Фота Паўла ПАТАШНІКАВА.

■ Думай сам

«ВІКІПЕДЫЯ»: давярай, але правярай

Намеснік кіраўніка Федэральнай службы па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі Аляксандр Бісераў прапанаваў... забараніць у Расіі «Вікіпедыю».

Прымяніць цэнзуру да бясплатнага энцыклапедычнага рэсурсу трэба, на думку Бісерава, «з прычыны каласальнай колькасці памылак», якія дрэнна ўплываюць на веды студэнтаў пры падрыхтоўцы да іспытаў менавіта пры дапамозе інтэрнэт-энцыклапедыі.

— Калі казаць пра маё стаўленне як філолага да «Вікіпедыі», то я не залічваю яе да дакладных крыніц, — падзялілася сваім поглядам з журналістам «Звязды» **намеснік міністра адукацыі нашай краіны Раіса СІДАРЭНКА**. — Сапраўды, там прысутнічаюць і памылкі, і недакладнасці, і некарэктныя фармулёўкі. Каб гэта заўважыць, не трэба быць спецыялістам. Але я бачу, што ёсць сітуацыі, калі «Вікіпедыя» выратоўвае вучняў. А памылкі сустракаюцца, на жаль, і ў падручніках. Таму я лічу, што трэба не забараняць рэсурс, а выпраўляць памылкі. Паколькі я сама «родам з Савецкага Саюза», то ў мяне захавалася звычка ў складаных сітуацыях карыстацца слоўнікамі. За апошні час з'явілася вялікая колькасць новых слоў, значэнне якіх я не заўсёды ведаю. А з даведачна-інфармацыйных рэсурсаў па рускай мове аддаю перавагу парталу gramota.ru, якому я давяраю.

Трэба сказаць, што з самага свайго заснавання ў студзені 2001 года «Вікіпедыя» ператварылася ў прадмет крытыкі і нападак. Настаўнікі і выкладчыкі забаранялі навучэнцам і студэнтам спасылацца ў сваіх работах на артыкулы са свабоднай энцыклапедыі. Прычына ў тым, што практычна кожны можа ўносіць сваю лепту ў энцыклапедычныя артыкулы, існуюць тысячы старонак, напоўненых недакладнай інфармацыяй, паклёпамі і проста смешнымі малюнкамі. Тым не менш мільёны людзей усё роўна чэрпаюць факты і лічбы з гэтага рэсурсу, пачынаючы з інфармацыі для школьных хатніх заданняў і заканчваючы карпаратыўнымі прэзентацыямі.

За 14 гадоў свайго існавання праект Джымі Уэйлса моцна разрос. «Вікіпедыя» ствараецца добраахвотнікамі з усяго свету на 277 сусветных мовах. Усяго ў энцыклапедыі прадстаўлена ўжо больш як 35 мільёнаў артыкулаў, у тым ліку больш як 1 мільён 184 тысячы артыкулаў на рускай мове. «Вікіпедыя» стала адным з самых папулярных вэб-сайтаў у свеце. І ўсё ж выкарыстоўваць «Вікіпедыю» ў якасці адзінай крыніцы інфармацыі небяспечна. Нават стваральнікі праекта папярэджваюць, што «Вікіпедыя не гарантуе праўдзівасці». Таму, як той казаў, «давярай, але правярай».

Надзея НІКАЛАЕВА

Рэцэпт гарбаты ад хатняй гаспадыні

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нацыянальны чэмпіянат па прыгатаванні чаю — першая падобнага роду падзея ў Беларусі, дзе на адной пляцоўцы сышліся розныя чайныя прафесіяналы і аматары духмянага напою, каб прадэманстраваць сваё майстэрства па заварванні і падачы гарбаты, а таксама пачаставаць ёю гледачоў. Чэмпіянат быў накіраваны на фарміраванне высокай чайнай культуры, абмен вопытам паміж спецыялістамі і развіццё прафесіяналізму тых, хто працуе ў сферы грамадскага харчавання. І прафесіяналы, і аматары чайнай цырымоніі спаборнічалі ва ўменні заварваць і падаваць гарбату. А шматлікія гледачы (а іх было некалькі соцень) вучыліся асновам чайнай цырымоніі. Падчас майстар-класаў гасцей знаёмілі з кітайскай, японскай традыцыямі. Кожны ахвотны мог паспытаць правільна завараны напой. У выніку лепшым у намінацыі «заварванне гарбаты» стаў Аляксей Купракоў з Брэста, лепшым дэгустатарам прызналі Вольгу Слізанову з Мінска. А лепшая падача была ў мінчанкі Насты Міхалкевіч. Дзяўчына прыгатавала чай гатунку «Сянчыла» і падала яго з ванільным бісквітам.

Анатоль КЛЯШЧУК.

Фота аўтара.

Як нацыянальнае становіцца сусветным

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пытанне ўнясення аб'ектаў у спіс — працэс доўгі і комплексны. Па-першае, неабходна падрыхтаваць на нацыянальным узроўні намінацыйнае дасье з улікам кансультацый экспертаў ЮНЕСКА, па-другое, кожная краіна мае права штогод уносіць толькі адну заяву. Трэба таксама ўлічваць сённяшнія жорсткія тэндэнцыі ў ЮНЕСКА наконт далейшага пашырэння спіса. Лічыцца, што спіс, які сёння ўключае 1007 сусветных аб'ектаў, вельмі «раздуты» і яго паступова трэба «закрываць». Гэтыя падыходы значна ўскладняюць працэс прасоўвання нашага дасье.

У 2009 годзе была створана камісія пры Савеце Міністраў па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія апынуліся за межамі Беларусі. Гэтая камісія на чале з намеснікамі міністраў замежных спраў і культуры збіраецца не менш аднаго разу на год і на падставе інфармацыі, у тым ліку нашых прадстаўніцтваў за мяжой, разглядае пытанне вяртання каштоўнасцяў Беларусі.

— Наколькі мне вядома, некаторым аб'ектам з папярэдняга спіса, у прыватнасці, Барысаглебскай царкве, патрабуецца рэстаўрацыя — калі яна будзе праведзена і праведзена так, каб будынак не страціў сваёй аўтэнтычнасці і гісторыка-культурнай каштоўнасці, то ёсць рэальныя шанцы на ўключэнне яго ў Спіс аб'ектаў сусветнай спадчыны. Аднак такіх майстроў і тэхналогій у нашай краіне няма. Якія намаганні прыкладаюць беларускія дыпламаты, каб прыцягнуць у нашу краіну патрэбных прафесіяналаў або хаця б экспертаў з адпаведнай камісіі ЮНЕСКА для кансультацыі?

— Пры разглядзе ўсіх гэтых пытанняў неабходна аб'яднаць намаганні ўсіх зацікаўленых — заканадаўцаў, экспертаў, рэстаўратараў і дыпламатаў.

Безумоўна, стан аб'екта мае значэнне пры падрыхтоўцы дасье. Але прыняцце рашэння адносна рэстаўрацыі аб'ектаў, якія адносяцца да гісторыка-культурнай спадчыны, заўсёды выклікае шмат пытанняў. Праблема ў неабходнасці высокапрафесійных спецыялістаў, фінансавых сродкаў, а таксама заканадаўчых умовах, бо сапраўды, рэстаўрацыя будынка не павінна прывесці да страты ім сваёй аўтэнтычнасці і каштоўнасці. Тут нам вельмі дапамагаюць міжнародныя эксперты. Хацеў бы згадаць міжнародны навукова-практычны семінар «Інтэграцыйны падыход у кіраванні аб'ектамі сусветнай спадчыны», які адбыўся ў нашай краіне восенню гэтага года. У ім прынялі ўдзел спецыялісты з Арменіі, Азербайджана, Літвы, Расіі, Украіны і іншых краін. Удзельнікі семінара не толькі абмеркавалі няпростыя пытанні, звязаныя з захаваннем і рэстаўрацыяй аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, але і наведалі беларускі аб'ект сусветнай спадчыны — Нясвіж. Вынікі семінара былі накіраваны ў Цэнтр сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Такім чынам мы ўзаемадзейнічаем з ЮНЕСКА ў рэгіянальным вымярэнні.

— Якую ролю ўвогуле адыгрываюць дыпламатычныя кантакты ў тым, каб аб'ект быў уключаны ў Спіс сусветнай спадчыны?

— Калі ідзе гаворка пра ЮНЕСКА, перш за ўсё мы павінны вызначыць ролю Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, якая каардынуе супрацоўніцтва нашай краіны з гэтай арганізацыяй. У камісію на чале з міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем уваходзяць прадстаўнікі розных дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў. Год таму мы змянілі структуру нацкамісіі, стварылі пяць тэматычных камітэтаў у яе рамках: па пытаннях культуры, адукацыі, інфармацыі, навукі і прыродазнаўчай адукацыі, моладзі і дзейнасці клубаў ЮНЕСКА. Гэта дазволіла пашырыць наша супрацоўніцтва з арганізацыяй.

Прыняцце рашэнняў пра ўключэнне аб'ектаў у Спіс сусветнай матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны заўсёды прымаецца на падставе меркаванняў зацікаўленых прафесіяналаў — членаў нацкамісіі, якія прапрацоўваюць усе пытанні з мясцовымі ўладамі і ўзаемадзейнічаюць непасрэдна з носьбітамі беларускіх абрадаў.

Дыпламатычныя кантакты асабліва неабходны для прасоўвання дасье на пляцоўцы ЮНЕСКА. Нашы дыпламаты ажыццяўляюць пастаянныя кантакты з Цэнтрам сусветнай спадчыны і кансультацыі з экспертамі, каардынуюць працэс.

— Легендарны крыж Еўфрасінні Полацкай не знойдзены дагэтуль. У 40-я гады, якраз пасля знікнення крыжа, сакратар ЦК КПБ Панамарэнка не раз казаў пра тое, што крыж не страчаны, а знаходзіцца ў распараджэнні кіраўніцтва Савецкага Саюза. Пазней, у 90-я гады, ААН паспрабавала шукаць крыж у Злучаных Штатах. Але ўжо шмат гадоў пра тое, ці шукаюць яшчэ крыж зараз, нічога не чуваць. Што было зроблена нашымі дыпламатамі, каб калі не вярнуць, то хаця б даведацца пра месцазнаходжанне беларускай рэліквіі?

— Страта легендарнага крыжа Еўфрасінні Полацкай — адна з сумных старонак гісторыі нашай краіны. Дагэтуль невядома, дзе і ў якім стане знаходзіцца крыж. На жаль, у розныя перыяды існавання нашай дзяржавы шмат нацыянальных каштоўнасцяў было вывезена за межы краіны. МЗС прымае актыўны ўдзел праз сетку сваіх дыпустаноў за мяжой у пошуку страчаных каштоўнасцяў. У 2009 годзе была створана камісія пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія апынуліся за межамі Беларусі. Гэтая камісія на чале з намеснікамі міністраў замежных спраў і культуры збіраецца не менш аднаго разу на год і на падставе інфармацыі, у тым ліку нашых прадстаўніцтваў за мяжой, разглядае пытанне вяртання каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Ёсць канкрэтныя вынікі. На жаль, мы не можам гэтага сказаць пра крыж Еўфрасінні Полацкай, які з'яўляецца своеасаблівым сімвалам нашай дзяржаўнасці. Але праца працягваецца, будзем спадзявацца, што і гэты рэлікт будзе знойдзены і прывезены на радзіму.

— 250-годдзе з дня нараджэння палітычнага дзеяча, дыпламата і кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага будзе святкавацца сёлета, яно і ўключана ў каляндар памятных дат ЮНЕСКА. Відаць, цэнтральным месцам правядзення розных памятных мерапрыемстваў будзе сядзіба Агінскіх у Залессі. Ці плануецца па лініі МЗС запрашэнне гасцей з ЮНЕСКА?

— Плануецца шмат мерапрыемстваў з нагоды 250-годдзя нараджэння Міхаіла Клеафаса Агінскага. Безумоўна, сядзіба Агінскіх у Залессі з'яўляецца знакавым месцам для святкавання гэтай знамянальнай даты ў нашай краіне. Але гэтым мы не будзем абмяжоўвацца. Жыццё і творчасць гэтай выдатнай асобы былі звязаны з многімі краінамі, таму мы працуем над падрыхтоўкай сумесных з Польшчай і Літвой прыгожых праектаў па святкаванні юбілейнай даты. Гаворка ідзе пра выставы, канцэрты і іншыя падзеі і ў штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы, а таксама ў Беларусі, Літве, Польшчы. Такія мерапрыемствы заўсёды збіраюць замежных гасцей, і гэтая гадавіна — не выключэнне.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Новы папярэдні спіс, які плануецца ўнесці да 1 лютага 2015 года, будзе ўключаць пяць аб'ектаў. Гэта нам дазволіць сфакусіраваць нашы намаганні на падрыхтоўцы якасных наменацыйных заяў і іх прасоўванні ў Спіс сусветнай спадчыны.

Аўгустоўскі канал з'яўляецца сумеснай матэрыяльнай спадчынай дзвюх краін.

— Якую ролю адыграе наша прысутнасць у календары памятных дат ЮНЕСКА за гэты год у тым, каб пра нашу краіну, нашых славутых дзеячаў і нашы цікавыя гістарычныя мясціны даведаліся жыхары розных краін свету?

— Каляндар памятных дат ЮНЕСКА — вельмі эфектыўная праграма арганізацыі, якая знаёміць сусветнае грамадства са славутымі дзеячамі і цікавымі гістарычнымі фактамі Беларусі. Удзел Беларусі ў гэтай праграме ўжо дазволіў распаўсюдзіць інфармацыю пра вядомых гістарычных асоб нашай краіны. Сярод іх Францыск Скарына, Ігнацій Дамейка, Напалеон Орда, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Іван Хруцкі, Іосіф Гашкевіч. Таксама дзякуючы календару мы распаўсюдзілі інфармацыю пра нашы знакавыя даты: 600-годдзе Белавежскай пушчы, 1150-годдзе Полацка.

Мы працуем над тым, каб кожны год каляндар ЮНЕСКА ўключаў памятныя для Беларусі гадавіны. Гэта будзе максімальна спрыяць распаўсюджванню ў арганізацыі, якая сёння налічвае 195 актыўных членаў, інфармацыі аб нашай краіне. На 2016–2017 гады мы ўнеслі ў ЮНЕСКА прапановы з нагоды 150-годдзя з дня нараджэння Льва Бакста і 500-годдзя выдання першай кнігі Францыскам Скарынай.

Гутарыла Надзея ЮШКЕВІЧ.



ДЛЯ МАЛЫХ ПРЫРОДАЗНАЕК

Відаць, многія пакаленні школьнікаў трымаюць у памяці колішні ўсесаюзны (а сёння — расійскі) часопіс «Юный натуралист». Ён заснаваны ажно ў 1928 годзе. Адрасаваны з самага пачатку школьнікам. Змяшчае матэрыялы пра прыроду, прыродазнаўства, біялогію і экалогію. У 1941–1956 гг. не выходзіў. Часам тыраж часопіса даходзіў да 4 млн экзэмпляраў. У «Юном натуралисте» друкаваліся В. Біянкі, М. Прышвін, К. Паўстоўскі, У. Салаухін, І. Акімушкін і іншыя пісьменнікі, вучоныя В. Обручаў, І. Мічурын, К. Ціміразеў, В. Рахілін і іншыя папулярызатары навукі.

Сёння не так проста падпісацца праз пошту на расійскі часопіс «Юный натуралист» (найперш — праз кошт падпіскі). Выдавецкі дом «Звязда» да часопіса «Родная прырода», пачынаючы з сёлетняга студзеня, дадаў спецвыпуск для эколагаў-пачаткоўцаў і малых прыродазнаек — «Юны натураліст». «Гэты свайго роду часопіс у часопісе будзе выходзіць пастаянна, — чытаем ва ўступным слове да першага выпуску. — Галоўнымі героямі на яго старонках будуць, відавочна, малыя і вялікія насельнікі нашых лясоў, балот, лугоў: птушкі, звяры, насякомыя, расліны. І вы, нашы юныя чытачы! Мы раскажам пра вашы добрыя справы, захапленні… Вас чакае найцікавейшае падарожжа ў свет роднай прыроды разам з навукоўцамі і пісьменнікамі…»

Вось з якіх рубрык пачынае беларускі «Юны натураліст» свой дыялог з чытачом: «Зялёная школа» (рэпартаж з экалагічнай гімназіі № 19 горада Мінска), «Эканавіны», «Урокі ў запаведніку», «Экатворчасць», «Заанавігатар», «Віктарына»… А ў раздзеле «Для самых маленькіх» — «Птушыны радавод» Юркі Голуба, вершаваная мініэнцыклапедыя «Хто як зімуе» Генадзя Аўласенкі. Ёсць у першым выпуску і запрашэнне да збору калекцыі фотаздымкаў «Жывёлы Беларусі».

Словам, пачатак пакладзены. Арыенціры вызначаны. Спадзяёмся, што «Юны натураліст», якога сёння апякуе «Родная прырода», стане выдатным часопісам прыродазнаўчага характару. Знойдзецца на яго старонках месца і геаграфічнаму, і экалагічнаму краязнаўству.

Павел АЛЬСОВЫ.

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
19 февраля 2015 г.
проводит повторный открытый аукцион № 01-Сф-15 по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь

Минский городской центр недвижимости

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены).
Предмет аукциона: право частной собственности на земельный участок.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

На торги выставляются 20 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в г. Минске (в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме):

№ предмета аукциона	Месторасположение земельного участка	Кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Начальная цена, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.	Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, бел. руб.
1	2	3	4	5	6	7
1.	ул. Тенистая, 31 (Первомайский район)	500000000009005569	0,0437	248 667 590	37 000 000	12 150 520
2.	пер. Малый Тростенец, 15А-2 (Заводской район)	500000000002008473	0,0604	250 208 940	37 000 000	12 150 520
3.	ул. Малый Тростенец, 15А (Заводской район)	500000000002008471	0,1054	436 616 620	65 000 000	12 150 520
4.	ул. Малый Тростенец, 1А -1 (Заводской район)	500000000002008470	0,0787	326 011 470	49 000 000	12 150 520
5.	пер. Малый Тростенец, 12А (Заводской район)	500000000002008469	0,0922	381 935 900	57 000 000	12 150 520
6.	пер. Малый Тростенец, 7А (Заводской район)	500000000002008472	0,1320	546 807 200	82 000 000	12 150 520
7.	пер. Грибной, 15 (Заводской район)	500000000002008271	0,0545	460 475 470	69 000 000	8 568 882
8.	проектируемый проезд № 3 в бывшей деревне Масюковщина (Фрунзенский район)	500000000006007162	0,0707	808 852 590	121 000 000	8 194 758
9.	проектируемый проезд № 3 в бывшей деревне Масюковщина (Фрунзенский район)	500000000006007161	0,0985	1 126 899 930	169 000 000	8 194 758
10.	ул. Таежная, 45 (Партизанский район)	500000000001033858	0,0512	417 290 750	62 000 000	5 148 923
11.	ул. Сеченова, 33 (Заводской район)	500000000002008252	0,0492	412 097 700	62 000 000	8 194 758
12.	пер. Братский, 29 (Заводской район)	500000000002008248	0,0541	453 135 450	68 000 000	8 194 758
13.	ул. Охотская, 166 (Заводской район)	500000000002008250	0,0473	396 176 700	60 000 000	8 194 758
14.	ул. Охотская, 138 (Заводской район)	500000000002008249	0,0449	376 074 150	56 000 000	8 194 758
15.	ул. Ангарская, 213 А (Заводской район)	500000000002008103	0,0564	442 985 400	66 000 000	6 530 359
16.	пер. Грибной, 46/19 (Заводской район)	500000000002008105	0,0477	374 645 700	56 000 000	6 791 106
17.	проезд Енисейский, 7 (Заводской район)	500000000002008102	0,0478	375 460 800	56 000 000	5 761 190
18.	ул. Чекалина, 49 (Заводской район)	500000000002008104	0,0440	345 602 400	56 000 000	6 100 140
19.	пер. 2-ой Радиаторный № 16 (по перечню) (Фрунзенский район)	500000000006007289	0,0826	1 231 966 610	185 000 000	8 194 758
20.	пер. 2-ой Радиаторный № 17 (по перечню) (Фрунзенский район)	500000000006007195	0,0754	1 124 579 690	169 000 000	8 194 758

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выдаваемыми эксплуатирующими и согласующими организациями.

Условия, предусмотренные в решении Минского горисполкома о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

Аукцион состоится 19 февраля 2015 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток (задатки) **не позднее 13 февраля 2015 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП – 100690830, назначение платежа – 04901, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах согласно настоящему извещению);

представить в УП «Минский городской центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6 с 4 февраля по 13 февраля 2015 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;

возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минским горисполкомом предоставляется рассрочка внесения платы за земельный участок. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, **решение Мингорисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.**

Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактный телефон: + 375 (17) 226 16 72.
Официальный сайт организатора торгов **www.mgcn.by.**

ЗАПРАШАЕМ
РАЗМЯСЦІЦЬ РЭКЛАМУ
Ў ГАЗЕЦЕ «ЗВЯЗДА»
Тэл./факс: (8 017) 287 17 79, 292 04 52.
E-mail: reklama@zviazda.by.

17 марта 2015 г. в 16.00. состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2014 год и основные направления деятельности общества в 2015 г.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году.
6. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Местонахождение ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Место проведения собрания: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Время регистрации в день проведения собрания с 15.30 до 16.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 09.03.2015 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200034706

УНП 100098854

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ГОДОВОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Годовое общее собрание акционеров

ОАО «Белэнергозащита»

состоится 20 марта 2015 года в 11 часов 00 минут по месту нахождения общества: г. Минск, пер. Бехтерева, 7.

Собрание проводится в очной форме. Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет осуществляться в день проведения собрания по месту (адресу) проведения собрания. Время начала регистрации: 10 часов 00 минут. Время окончания регистрации: 10 часов 45 минут.

Дата формирования реестра владельцев акций общества, на основании которого будет составлен список лиц, имеющих право на участие в собрании: 9 марта 2015 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год (отчеты органов управления и контроля Общества) и основных направлениях деятельности Общества на 2015 год.
2. Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества, распределение прибыли и убытков Общества по результатам 2014 года.
3. Об утверждении дивидендов за 2014 год.
4. Об избрании членов наблюдательного совета Общества.
5. Об избрании членов ревизионной комиссии Общества.
6. О вознаграждениях и компенсациях расходов членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. О внесении изменений в Устав ОАО «Белэнергозащита» в соответствии с Уставом ГПО «Белэнерго».

Ознакомление лиц, имеющих право на участие в собрании, с информацией (документами), подлежащими предоставлению при подготовке к проведению собрания, будет осуществляться в рабочие дни и рабочее время с 11 по 19 марта 2015 года по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, 7, а в день проведения собрания – во время и в месте проведения собрания.

Для регистрации участнику собрания необходимо предъявить документ, удостоверяющий личность, а также, если необходимо, документы, подтверждающие его полномочия: доверенность и/или другие документы в соответствии с действующим законодательством.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует о типографской опечатке в дате начала размещения на бланках облигаций банка 185-го выпуска.
Данную дату следует читать «31 января 2015 года».

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

Утерянные представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланки полисов по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории государств-членов системы «Зеленая карта» серии BY01 №№ 10079145, 10257044 **считать недействительными.** УНП 100122726

1СУ «Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов)» серии КС №№ 1871205-1871210 в количестве 6 штук Представительства Белгосстрах по Дзержинскому району **считать недействительным.** УНП 600013344

09 марта 2015 года в 12.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «ЦентроСтройОфис».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и основные итоги направления деятельности Общества в 2015 г.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году и в первом квартале 2016 г.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О сделках Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

Начало регистрации — 11.00.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания с 10.00 до 16.00, начиная с 27.02.2015 года: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

УНП 191303207

09 марта 2015 года в 14.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «ЭнКоСтрой».

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и основные итоги направления деятельности Общества в 2015 г.
2. Отчет Совета директоров Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году и в первом квартале 2016 г.
6. Избрание членов Совета директоров и ревизионной комиссии Общества.
7. О материальном вознаграждении членов Совета директоров и ревизионной комиссии Общества.
8. О сделках Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

Начало регистрации — 13.00.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания с 10.00 до 16.00, начиная с 27.02.2015 года: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

УНП 191303197

09 марта 2015 года в 13.00 состоится очередное общее собрание акционеров ОАО «Минскэнергострой»

Повестка дня:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2014 год и основные итоги направления деятельности Общества в 2015 г.
2. Отчет Наблюдательного совета Общества.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков Общества за 2014 г.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков Общества за 2014 г.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2015 году и в первом квартале 2016 г.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. О сделках Общества.

Собрание будет проходить по адресу: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

Начало регистрации — 12.00.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания с 10.00 до 16.00, начиная с 27.02.2015 года: г. Минск, ул. Монтажников, 39, ком. 208.

УНП 100008291

ТАЛАЙ Б'Е РЭКОРДЫ

У тыднёвым спартыўным агляд-зе «Звязда» распавядае пра медальны дэбют беларускай фрыстайлісткі на этапе Кубка свету, крыўднае паражэнне «Дынама» ад «АкБарса» і іншыя цікавыя падзеі ў беларускім спорце.

1. Мужчынская зборная Беларусі па гандболе заняла выніковае 18-е месца на чэмпіянаце свету ў Катары. У фінале «Кубка Прэзідэнта» — суцяшальнага турніру, дзе разыгрываліся месцы з 17-га па 24-е, — падапечныя Юрыя Шаўцова ў серыі сяміметровых кідкоў саступілі камандзе Чэхіі. Гэты вынік стаў найгоршым у гісторыі выступленняў нашай зборнай на чэмпіянатах свету. У 1995 годзе беларусы сталі дзявятымі, у 2013 годзе — пятнаццатымі. Адзначым, што, не трапіўшы ў плэй-оф першынства, наша каманда згубіла шанц атрымаць пуцёўку на Алімпіяду ў Рыа-дэ-Жанейра. Цяпер, каб кваліфікавацца на алімпійскі турнір падапечным Юрыя Шаўцова трэба выйграваць чэмпіянат Еўропы-2016.

Чэмпіёнамі свету сталі французы, якія ў фінале перайгралі гаспадароў турніру — зборную Катара (25:22). А каманда Іспаніі сенсацыйна саступіла палякам у барацьбе за бронзавыя медалі (28:29).

2. Беларуская лёгкаатлетка Аліна Талай удала пачынае новы сезон. Спачатку на міжнародным турніры ў

Дзюсельдорфе спартсменка ўстанавіла рэкорд сезона на дыстанцыі 60 м з бар'ерамі — 7,96 с. На наступным старце ў Маскве Талай зноў паказала першы час на гэтай дыстанцыі. Адзначым, што рэкорд Еўропы ў 60 м з бар'ерамі належыць шведскай лёгкаатлетцы Сюзане Калур — 7,68 с.

3. Хакейнае «Дынама-Мінск» пацярпела чацвёртае паражэнне запар, саступіўшы казанскаму «АкБарсу» (1:2). Адзіную шайбу ў «зубраў» закінуў Мэт Элісан. У трэцім перыядзе шанц параўнаць лік быў у Сяргея Дразда: шайба пасля кідка форварда «прайшлася» па штангах, але, як было бачна на відэапаўторах, лінію варот не перасекла. Дарэчы, гэты момант выклікаў гарачыя дыспуты наконт правільнасці рашэння суддзяў, якія не залічылі гэтую шайбу.

Галоўны трэнер «Дынама» Любамір ПОКАВІЧ так пракаментаваў вынік матча: «Гэта была цікавая гульня. У нас быў не вельмі добры пачатак, і сапернік вёў 2:0, але хлопцы здолелі вярнуцца ў гульню. У трэцім перыядзе мы мелі дастаткова момантаў: добра прэсінгавалі, але забіць так і не змаглі. Апошнім часам нам не шанцуе...»

Ужо сёння «бела-сінія» згуляюць на «Мінск-Арэне» з «Мядзвешчакам».

4. Зборная Беларусі па фрыстайле ў складзе Ганны Гуськовай, Дзяніса Осіпава і Станіслава Гладчанкі **заняла другое месца ў камандных спаборніцтвах на этапе Кубка свету** ў амерыканскім Лэйк-Плэсідзе.

Цікавымі атрымаліся спаборніцтвы ў жанчын. Фаварыткі турніру — кітайскія фрыстайлісткі — не здолелі прабіцца ў дзясятку найлепшых. На іх фоне выдатна выступілі спартсменкі з Еўропы і Паўночнай Амерыкі. Упершыню на п'едэстал трапіла беларуска Аляксандра Раманоўская. І адразу на першую прыступку! За свой фінальны скачок васямнаццацігадовая спартсменка атрымала 80,62 бала, апярэдзіўшы Вераніку Корсунаву з Расіі і Мелісу Карбо з Канады.

5. Баскетбольны клуб «Цмокі-Мінск» атрымаў трэцюю перамогу ў сезоне, на сваёй пляцоўцы перайграўшы «Чырвоныя Крылы» з Самары — 74:66. У сярэдзіне апошняга перыяду ў «драконаў» была перавага «+18», але госці здолелі больш чым удвая скараціць адставанне. Тым не менш, мінчане ўтрымалі перамогу. Сярод найлепшых гульцоў у «Цмокаў» — Бранка Міркавіч з 15 ачкамі і Іван Мараш з 13.

«У апошні час мы дэманстравалі добрую гульню, але праз статус сапернікаў не маглі дабіцца выніку, — рэзюмаваў пасля паядынка **галоўны трэнер «Цмокаў» Андрэй ГРЫШЧУК.** — Адзіны недахоп — расслабленасць каманды пасля істотнай перавагі. Прычына падобнага спаду ў канцоўцы — паспешныя рашэнні ў атацы. Будзем гэта выпраўляць».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

Узняцца з кален...

Карэспандэнты «Звязды» наведалі трэніроўку зборнай Кубка Федэрацыі

Апошні раз жаночая зборная Беларусі па тэнісе магла пахваліцца прапіскай у элітнай Сусветнуй групе Кубка Федэрацыі тры гады таму. Пасля балючага паражэння ад амерыканак (0:5) у 2012 г. наша каманда апусцілася ў ніжэйшую — Еўра-Афрыканскую — групу. Як аказалася, надоўга...

Сёлета нашы дзяўчаты трэці сезон запар будуць спрабаваць выбрацца з нізкага дывізіёна каманднага чэмпіянату свету, як яшчэ называюць Кубак Федэрацыі. І ў гэты раз шанцы на поспех неблагія. Тым больш што ўпершыню за чатыры гады да каманды далучыцца былая першая ракетка свету, лепшая тэнісістка нашай краіны Вікторыя Азаранка. Тое, што гэта не банальныя гіпотэзы, пацвердзіла **капітан беларускай зборнай Кубка Федэрацыі Таццяна ПУЧАК:**



Вольга ГАВАРЦОВА трэніруе падачу.

— Адразу пасля Australian Open Віка пачала рыхтавацца да Кубка Федэрацыі. Праўда, па індывідуальнай праграме, асобна ад каманды. Але ўжо ў Будапешце зборная будзе ў поўным складзе.

Акрамя Азаранкі, у каманду выклікалі Вольгу Гаварцову, Аляксандру Сасновіч і шаснаццацігадовую Веру Лапко. Для апошняй гэта будзе дэбют за зборную.

— Першапачаткова на пазіцыю чацвёртага нумара мы заяўлялі Ірыну Шымановіч, але ў яе ўзніклі праблемы са спінай, часу на папраўку не хапіла, — распавяла Пучак. — Вера ж выдатна выступае ўжо другі юніёрскі сезон запар. Я бачыла яе ў справе на юніёрскім камандным чэмпіянаце свету летась, і яе тэніс мяне ўразіў.

А вось мінулы сезон для вопытнай Вольгі Гаварцовай стаў самым няўдалым у прафесійнай кар'еры тэнісісткі. Траўма калена паўплывала не толькі на пагаршэнне вынікаў, падзенне ў рэйтынгу (цяпер Гаварцова займае 156-е месца ў сусветнай класіфікацыі. — **Аўт.**), але і на якасную падрыхтоўку да сезона-2015.

— Так, на першых турнірах у Кітаі і Аўстраліі не ўсё склалася, як хацелася. Я згуляла некалькі складаных трохсэтавых матчаў, «падсела» фізічна, і на кваліфікацыю Australian Open сіл ўжо не хапіла. Але і ў гэтым можна знайсці пазітыў: раней прыляцела ў Мінск і пачала рыхтавацца да Кубка Федэрацыі. У нас вельмі добрая каманда, і калі мы ў кожным матчы будзем выкладвацца напоўніцу, абавязкова выйдзем у Сусветную групу.

На групавой стадыі нашых дзяўчат чакаюць паядынкі супраць грузінак, балгарак і партугалак. Беларускія тэнісісткі паспелі вывучыць гэтыя каманды дасканала. З балгаркамі і партугалкамі, напрыклад, гулялі ў мінулым годзе, з грузінкамі — у пазамінулым.

— Самы складаны сапернік — Балгарыя, — лічыць другая ракетка краіны Аляксандра Сасновіч. — У іх таксама ёсць моцны першы нумар — Цвятана Піронкава. Супраць яе я яшчэ не гуляла. Партугалкі таксама могуць быць небяспечнымі. Я, напрыклад, пакуль не абыгрывала іх першы нумар — Мішэль Ларшэр дэ Брыту. А вось з астатнімі трэба спраўляцца лёгка.

Другая ракетка краіны — Аляксандра САСНОВІЧ.

У выніку перамогі ў групе нашу каманду чакаюць стыкавыя матчы з пераможцай адной з суседніх груп. І асцерагацца тут ёсць каго. Праблемы беларускім тэнісісткам могуць стварыць каманды Украіны, Бельгіі, Харватыі... Зрэшты, не будзем забягаць далёка наперад. Першыя матчы нашы дзяўчаты правядуць ужо заўтра. Верым у каманду!

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

БРАЗІЛЬСКІ МАЙСТАР НА БЕЛАРУСКІМ ПАРКЕЦЕ

Карэспандэнт «Звязды» ўбачыў у справе першага бразільскага легіянера ў чэмпіянаце краіны на міні-футболе

Апошнім часам навіны пра зальны футбол не сыходзяць з галоўных стужак спартыўнай інфармацыі краіны. На пазамінулых выхадных варатар першалігавай каманды «МКК-Рагачоў» падчас гульні з кулакамі накінуўся на суддзю і адправіў таго ў накаўт. А вось са «Сталіцы», нашага чэмпіёна, прыйшла куды больш пазітыўная навіна. Клуб упершыню ў гісторыі беларускага міні-футбола падпісаў кантракт з бразільцам Раніньё. Гістарычная падзея! У нядзелю ён адчуў на сабе, што такое галоўнае міні-футбольнае супрацьстаянне Мінска.

Усе 500 месцаў у нядаўна пабудаваным спарткомплексе МАПІДа занятыя. На трыбунах, як і на пляцоўцы, таксама горача. Яшчэ б! Гуляюць гранды: дзеючы і трохразовы чэмпіён краіны. Балельшчыкі апладзіруюць пасля прыгожых дзеянняў футбалістаў, скандзіруюць назвы любімых камандаў і не трымаюць язык за зубамі падчас спрэчных момантаў на паркеце.

— Гэй, суддзя! — пасля балючага сутыкнення сапернік з мапідаўскім варатаром Андрэем Чурылiным на поле гатовы выскачыць балельшчык з першых шэрагаў. — Ты што не бачыш? Ён яго каленам ударыў!

Дарэчы, Чурылін. Гэты хлопец у зялёнай футболцы хоць і прапусціў двойчы ад «Сталіцы», неверагодным чынам адбіваў усё, што ляцела ў яго вароты. З усіх куткоў, з усіх адлегласцяў. Матч, які праходзіў на сустрэчных курсах, завяршыўся перамогай МАПІДа — 5:2. Усё ж такі «домабудаўнікі» лепей за сапернікa карысталіся сваімі магчымасцямі, наблізіліся да лідараў і працягваюць змагацца за ўзнагароды. А як выглядаў бразілец, спытаеце вы? Хто-хто, а чарнявы Ранінья наўрад ці занясе сабе гэты матч у актыў. На відэа, якія знайшоў у інтэрнэце, ён дэманструе фенаменальную тэхніку, як кажуць, на мяжы з фантастыкай, а ў гэтым матчы выглядаў даволі сціпла.

З мячом — бразілец Раніньё.

— Ён знаходзіцца не ў аптымальнай форме. Гуляў з мікратраўмай, — растлумачыў сітуацыю **Уладзімір Левус, галоўны трэнер «Сталіцы»**. — У нашай камандзе ёсць яшчэ некалькі траўмаваных гульцоў. Спадзяюся, яны хутка паправяцца і наша галоўная перамога — наперадзе.

У чэмпіянаце Беларусі ўдзельнічаюць 16 каманд. Паводле табліцы ў пяцёрку лідараў уваходзяць «Лідсельмаш» (Ліда), «Вітэн» (Віцебск), «Сталіца» (Мінск), БЧ (Гомель) і «МАПІД» (Мінск).

У сваю чаргу пераход бразільскага майстра ў беларускі клуб мы папрасілі пракаментаваць **Андрэя Мядзведзева, старшыню праўлення «Сталіцы»**:

— Калі ў каманду прыходзіць легіянер высокага класа, ён уздымае інтарэс да чэмпіянату. Пра запрашэнне падобнага футбаліста мы разважалі яшчэ падчас леташняга першынства, напачатку сёлетняга. Аднак нам не хацелася везці проста чалавека з бразільскім пашпартам. Мы імкнуліся падпісаць кантракт з прафесіяналам высокага класа. Перагаворы вяліся насамрэч нядоўга. У Раніньё закончыўся кантракт з парыжскім «Спортынгам», і ён падпісаў з намі дамову да канца чэмпіянату.

— Як вырашаюцца бытавыя пытанні?

— Усё вырашаем у рабочым парадку. Справа ў тым, што ён некалькі сезонаў правёў у Грузіі і ва Украіне. У яго, дарэчы, жонка — грузінка. І яна ў гэтым пытанні яму вельмі дапамагае.

— На маю думку, пераход бразільца ў вашу каманду — добры іміджавы крок для калектыву.

— Мы ставілі перад сабой дзве мэты. Па-першае, гэта імідж не столькі клуба, колькі віду спорту. Адно ад другога не трэба аддзяляць. Па-другое, Раніньё — футбаліст высокага ўзроўню. Ён гуляе за зборную Грузіі, неаднаразова ўдзельнічаў у фінале чатырох Кубкаў УЕФА. Гэта сведчыць пра многае.

— Колькі наогул легіянераў гуляюць за «Сталіцу»?

— Усяго іх 5. Акрамя бразільца, за нас гуляюць расійскі варатар і тры ўкраінцы.

— Да слова, украінцаў даволі шмат у нашым міні-футболе. Едуць да нас праз складаную эканамічную сітуацыю ў краіне?

— Безумоўна, у мінулым годзе першынство Украіны ўваходзіла ў пяцёрку наймацнейшых чэмпіянатаў Еўропы. Там заўжды было шмат легіянераў, у тым ліку і бразільскіх. У сувязі з вайной многім клубам цяжка фінансава ўтрымліваць і легіянераў, і мясцовых футбалістаў. Гэтым і абумоўлены прыток украінцаў у наш чэмпіянат. Столькі замежнікаў у нас яшчэ ніколі не гуляла. Але я лічу, што гэта добра. Бо расце ўзровень першынства, растуць нашы хлопцы. Узрастае канкурэнцыя ўнутры каманды і ў самім чэмпіянаце.

Тарас ШЧЫРЫ.
Фота аўтара.

ГАРАСКОП СТРЫЖАК НА ЛЮТЫ

3 лютага, аўторак. Неспрыяльны час для стрыжкі валасоў. Могуць адбыцца негатыўныя падзеі ва ўсіх галінах жыцця.

4 лютага, серада. Поўня. Неспрыяльны час для наведвання цырульніка.

5 лютага, чацвер. Неспрыяльны час для стрыжкі. Абстрыжаныя валасы прыцягваюць духаў, якія выкарыстоўваюць энергію чалавека.

6 лютага, пятніца. Неспрыяльны час для наведвання цырульніка. Стрыжка ў гэты дзень прыцягвае няшчасці і страты, у тым ліку здароўя.

7 лютага, субота. Спрыяльны дзень для стрыжкі, аднаўлення пашкоджаных валасоў.

8 лютага, нядзеля. Устрымайцеся ад стрыжкі ў гэты дзень, таму што вынікам могуць стаць песімістычныя адносіны да жыцця, дэпрэсіі.

9 лютага, панядзелак. Добры дзень для стрыжкі валасоў. У выніку вы атрымаеце прыгажосць і ўнутраную гармонію.

10 лютага, аўторак. Сёння цалкам прыдатны дзень для стрыжкі і для афарбоўвання, праўда, пры ўмове, што вы не збіраецеся нічога мяняць, а проста хочаце абнавіць форму і падфарбаваць карані.

11 лютага, серада. Пасля стрыжкі ў гэты дзень валасы будуць адрастаць больш павольна. Таму дзень падыходзіць для аматараў кароткіх прычосак.

12 лютага, чацвер. Сёння менавіта той месяцовы дзень, калі абрэзаная грыўка можа кардынальна змяніць лёс.

13 лютага, пятніца. Стрыжка валасоў прынясе шчасце і ўпэўненасць у сабе.

14 лютага, субота. У выніку стрыжкі валасоў ўзрасце прывабнасць — вы будзеце падабацца людзям.

15 лютага, нядзеля. Добра стрыгчы валасы тым, у каго аслабленае фізічнае здароўе і каму надакучыла манатоннасць ў жыцці, каму не хапае актыўнасці, смеласці і валявых якасцяў.

16 лютага, панядзелак. Добры дзень для стрыжкі валасоў. Нічога новага такая стрыжка ў жыццё не прынясе, але атрымаецца прыгожай і ўдалай, што пазітыўна паўплывае на настрой.

17 лютага, аўторак. У гэты дзень лепш пазбягаць стрыжак і іншых маніпуляцый з валасамі. Інакш яны могуць пачаць выпадаць.

18 лютага, серада. Сёння сатанінскі месяцовы дзень: не варта стрыгчы валасы, інакш вы можаце страціць нешта каштоўнае для сябе.

19 лютага, чацвер. Неспрыяльны час для наведвання цырульніка, не плануйце стрыжку ў гэты час.

20 лютага, пятніца. Наведванне цырульніка ў гэты дзень справакуе грашовыя страты і праблемы са здароўем.

21 лютага, субота. На календары стрыжкі — неспрыяльны дзень.

22 лютага, нядзеля. Неспрыяльны час, бо стрыжка ў гэты дзень паскарае рост валасоў са стратай іх якасці.

23 лютага, панядзелак. Спрыяльны дзень для стрыжкі і афарбоўвання валасоў. Стрыжка прыцягне шчасце, палепшыць знешні выгляд.

24 лютага, аўторак. Выдатны дзень. Новая стрыжка прынясе прывабнасць і здароўе валасоў.

25 лютага, серада. Найлепшы дзень для наведвання цырульніка. Валасы будуць хутка расці.

26 лютага, чацвер. Калі стрыгчы валасы ў гэты дзень, то гэта прыцягне праблемы, перашкоды і хваробы.

27 лютага, пятніца. Лепш перанесці візіт да цырульніка, інакш магчыма абвастрэнне хвароб і з'яўленне новых.

28 лютага, субота. Дзень не падыходзіць для стрыжкі, ад афарбоўвання таксама лепш адмовіцца.

Даты Падзеі Людзі

3 ЛЮТАГА

1700 год — 315 гадоў таму пачалася Паўночная вайна кааліцыі еўрапейскіх дзяржаў пад назвай Паўночны саюз (Данія, Саксонія, Расія, Рэч Паспалітая, Прусія) супраць Швецыі за панаванне на Балтыйскім моры. З 1704 па 1709 год асноўнай арэнай баявых дзеянняў была Беларусь, якая панесла велізарныя людскія і матэрыяльныя страты. Вайна працягвалася 21 год і завяршылася паражэннем Швецыі.

1919 год — адбылося першае пасяджэнне Лігі Нацый, міжнароднай арганізацыі супрацоўніцтва народаў за мір і бяспеку. Яна была створана адразу пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. Ужо праз 16 гадоў у яе ўваходзіла 58 дзяржаў-удзельніц. Ліга Нацый вельмі паспяхова дапамагала бежанцам, аказвала пасільную эканамічную дапамогу краінам, якія пацярпелі ў выніку вайны. Але ў канцы 30-х гадоў гэтая арганізацыя практычна спыніла сваю дзейнасць. Да таго часу вялікія дзяржавы вырашылі дзейнічаць у сваіх інтарэсах, а не ў інтарэсах сусветнай супольнасці. Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны Ліга Нацый была ліквідаваная. 18 красавіка 1946 года яе актывы і абавязацельствы былі перададзеныя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

1955 год — 60 гадоў таму нарадзіўся Уладзімір Васільевіч Жаркоў, беларускі вучоны ў галіне анкалогіі, доктар медыцынскіх навук (1991), прафесар (1993), заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1978 годзе скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут. З 1980-га — урач-анколаг, галоўны навуковы супрацоўнік аддзялення таракальнай анкапаталогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя Аляксандрава. Аўтар навуковых прац па хірургічным лячэнні хворых на рак лёгкіх метадам камбінаваных аперацый з рэзекцыяй жыццёва важных структур і органаў міжсцення і інш.

Было сказана

Ян СКРЫГАН, пісьменнік, навеліст, публіцыст:

«Чалавек мае найвялікшую здольнасць — смяяцца з самога сябе. Можа, гэта і не надта справядлівы занятак — здзек з самога сябе, але затое патрэбны».

НАРОДЖАНЫЯ 2 лютага

Адданасць сваім культурным караням вылучае іх з агульнага асяроддзя. Гэта асобы выпешчаныя, вытанчаныя і дасканалыя, могуць зрабіць немагчымае без бачных намаганняў, і толькі ім вядома, што за гэтым стаіць жорсткая дысцыпліна і ўпартая праца. Яны не імкнуцца ўздзейнічаць на развіццё падзей, але, мінуючы перашкоды, вымушаюць іншых дзейнічаць па сваіх правілах. Пад іх знешнім спакоем хаваецца нястрымны тэмперамент. Яны арыгінальныя ў выкананні грамадскіх абавязкаў, але нядбайныя і няўважлівыя ў асабістым жыцці, здольныя заглыбіцца ў сябе і ніколі не падзяляюць чужыя нягоды і радасці.

НАРОДЖАНЫЯ 3 лютага

Людзей, больш захопленых сваёй прафесійнай дзейнасцю, чым яны, проста не існуе. Яны валодаюць сваім рамяством дасканала, хоць і не вельмі арыгінальныя. Імкнуцца працаваць самастойна, цярплівыя і ўпартыя, умеюць аб'ектыўна ацэньваць свае магчымасці. Іх не палохаюць зменлівыя абставіны, але ім цяжка дасягнуць стабільнасці і раўнавагі, таму што жыццё ў іх лёгкадумнае: яны не могуць цвяроза ацэньваць рэчаіснасць, разрываючыся паміж бескарыслівай любоўю і эмацыянальнай глухатой, вытанчанасцю і прытворствам, зграбнасцю і ганарлівасцю. Для іх важна звесці да мінімуму супярэчлівасці паміж гэтымі полюсамі іх характару.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.53	17.54	9.01
Віцебск —	8.48	17.39	8.51
Магілёў —	8.44	17.44	9.00
Гомель —	8.35	17.46	9.11
Гродна —	9.08	18.10	9.02
Брэст —	9.03	18.15	9.12

Месяц

Поўня ў 1.08.

Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Агніі, Валяр'яна, Ілыі, Максіма, Яўгена.*

К. *Яны, Іпаліта.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ты сапраўды вегетарыянка?

— Так. Але мяса ем. Бо смачна.

У маіх суседзяў лямпавы тэлевізар, і кожны раз, калі яны крычаць «гол!», праз 3—4 секунды гол забіваюць і ў мяне на вадкакрысталічным.

Два следчыя абмяркоўваюць рабаванне:

— Я разумею, чаму рабаўнік узяў з сейфа грошы і каштоўнасці. Але навошта ён звёз жонку пацярпелага?

— Думаю, каб той яго не шукаў.

Дзеці — кветкі жыцця :)

— Тата, а пячы бліны цяжка?

— Зусім не. Бярэш муку, яйкі...

— Ну тады зрабі, калі ласка. Раз табе не цяжка...

■ Ну і ну!

МАЛАТКОМ… ПА ПАЛЬЦАХ КВАТЭРАЗДЫМШЧЫКУ

У Мінску патэнцыяльнага арандатара кватэры збілі пры дапамозе… малатка.

Падрабязнасці распавялі ў Першамайскім РУУС. Малады чалавек разам са знаёмым спыніў спадарожную машыну. Яе кіроўца пагадзіўся падвезці таварышаў. Падчас размовы высветлілася, што ён шукае арандатараў у двухпакаёвую кватэру. Пасажыры выказалі жаданне паглядзець варыянт. Незвычайным было тое, што гаспадар папрасіў хлопцаў прынесці прадукты, каб адзначыць знаёмства.

У прызначаны час маладыя людзі з'явіліся па названым адрасе. Аднак дамовіцца наконт платы за арэнду бакі не змаглі. Калі стала зразумелым, што вырашыць пытанне ўсё роўна не атрымаецца, патэнцыяльныя кватаранты прапанавалі гаспадару жылля вярнуць грошы, што былі патрачаны на прадукты. Мужчына пагадзіўся зрабіць гэта падчас наступнай сустрэчы. Ведалі б маладыя людзі, што будзе далей…

Калі хлопец прыйшоў па грошы, яго чакаў ужо далёка не дружалюбны прыём. Гаспадар кватэры разам са сваёй знаёмай… аблілі яго спіртазмяшчальнай вадкасцю, звязалі і запатрабавалі напісаць распіску. Сур'ёзнасць намераў зламыснікі пацвярджалі ўдарамі па пальцах рук пацярпелага… малатком.

У міліцыю патэлефанавалі таварышы маладога чалавека, якія засталіся чакаць таго ў пад'ездзе. Пачуўшы, што ў кватэры адбываецца нешта не тое, яны паспрабавалі прыйсці на дапамогу пацярпеламу, аднак патрапіць у жыллё не змаглі. У адносінах да гаспадара кватэры і яго знаёмай заведзена крымінальная справа, праводзіцца праверка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

700 КАНТРАБАНДНЫХ ТЭЛЕВІЗАРАЎ

У рэспубліканскім пункце мытнага афармлення «Новая Гута» гомельскія мытнікі праверылі груз, які правозіў у Расію грамадзянін Венгрыі. Дарэчы, кіроўца прадаставіў дакументы на тавар: «панэль вадкакрысталічная, актыўныя матрычныя прылады на вадкіх крышталях для тэлевізараў, без корпуса». Між тым, у грузавым адсеку аўтамабіля знаходзілася 700 тэлевізараў дзвюх мадэляў на суму звыш Br7,6 млрд. Такім чынам перавозчык спрабаваў ухіліцца ад выплаты мытнай пошліны. Распачаты адміністрацыйны працэс, а незаконна ўвезены тавар канфіскаваны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.041. Індэкс 63850. Зак. № 429. Нумар падпісаны ў 19.30 2 лютага 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12